Сямейная газета

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

11 СТУДЗЕНЯ 2018 г. ЧАЦВЕР № 7 (28623)

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

У блізкага чалавека дэпрэсія. Што рабіць?

Замовіла мужа ў... валуна

Які мёд самы смачны

ЦЫТАТА ДНЯ

Ірына КАСЦЕВІЧ, міністр працы і сацыяльнай абароны:

«Мы жывём у XXI стагоддзі, гэта час высокіх хуткасцяў. Калі жанчына сядзіць тры гады ў дэкрэце, яна адстае прафесійна, выпадае з абоймы. Але многае залежыць ад яе самой. Віртуальная адукацыя дазваляе павышаць свой прафесійны ўзровень па многіх кірунках дыстанцыйна. Акрамя таго, выходзіць з дэкрэтнага водпуску можна і раней. Або выйсці на палову стаўкі, і пры гэтым будзе захоўвацца дапамога па доглядзе за дзіцем. Нагадаю, мы прапрацоўваем пытанне аб увядзенні абавязковага водпуску на некалькі дзён і для бацькаў. Ён будзе неаплачваемы. Яго мае права ўзяць мужчына, які хоча дапамагчы жонцы ў гэты няпросты перыяд. І калі ён вырашыў, то наймальнік абавязаны будзе прадаставіць такі водпуск».

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 11.01.2018 г.

Долар ЗША	2,0146	▲
Еўра	2,4059	▲
Рас. руб.	0,0354	▲
Укр. грыўня	0,0710	▼

ISSN 1990 - 763X

ТРЫ СЯСТРЫ І «КОНІКІ»

Лідзія НЕКРАШЭВІЧ (у касцюме Снежнай Каралевы), яе малодшыя родныя сёстры Наталля КАВАЛЕНКА і Соф'я САМСОН рыхтуюцца да «Конікаў» — так называецца ў Давыд-Гарадку Шчадроўны вечар (трынаццатага студзеня). Па традыцыі на Стары Новы год уся іх радня — а гэта сем сясцёр і братоў са сваімі жонкамі, мужамі, дзецьмі і ўнукамі (усіх дваццаць чалавек) — шыюць адметныя карнавальныя касцюмы і маскі, каб сустрэць самы радасны час старажытнага Гарадка, хадзіць па вуліцах, заходзіць у дамы і віншаваць гарадчукоў: весяліць іх, іграць на гармоніках, біць у бубны і танцаваць да стомы.

— Яшчэ з самага маленства мы бегалі на «Конікі» калядаваць, спяваць абрадныя песні і красавацца сваімі ўборамі, — кажуць сёстры. — Таму і захавалася народная традыцыя, якую цяпер лічаць сапраўдным духоўным скарбам Палесся.

Нягледзячы на ўзрост (старэйшай сястры ўжо ідзе семдзесят восьмы год), жанчыны з нецярплівасцю чакаюць пачатку каляднага карнавалу.

Анатоль КЛЯШЧУК, фота аўтара.

Столінскі раён.

■ Вандроўнікі і маршруты

ТУРЫСТЫЧНА ПРЫВАБНЫЯ... КАМЯНІ

Натхняемся даўніной

Павел КАРАЛЁЎ з тых людзей, якія могуць дакладна назваць дату, калі ўлюбіліся. У 2002 годзе хлопец пабываў на рыцарскім фестывалі ў Навагрудку і там адчуў цягу да беларускасці. З таго часу пачаліся вандроўкі, праца ў Беларускім дзяржаўным музеі народнай архітэктуры і побыту, аднаўленне сядзібна-паркавага маёнтка Сёмкава пад Мінскам... Сёння Павел — супрацоўнік музея Янкі Купалы і адзін з аўтараў турыстычнага маршруту «Мінскае кола». Мы распыталі нашага суразмоўніка, якім чынам руіны дзейнічаюць на турыста і навошта беларускім гарадам рыцары.

СТАР. 4

■ Тэхналогіі

АСЦЯРОЖНА: МАБІЛЬНЫ ШПІЁН

Як схавацца ад разумных гаджэтаў?

У інфармацыйным грамадстве цяжка жыць у афлайне. Большасць людзей ужо не ўяўляе сябе без смартфона. Сёння працоўныя і іншыя пытанні вырашаюцца праз сацыяльныя сеткі і месенджары. Мы пастаянна звяртаемся да пошукавікаў па адказы. Пры гэтым рэдка задумваемся, што ведаюць пра нас тыя кампаніі, якія адказваюць за дзейнасць усіх нашых прылад. А яны збіраюць велізарны масіў даных аб кожным, пачынаючы ад густаў у ежы і падарожжах, заканчваючы псіхалагічным партрэтам асобы. І тут з'яўляюцца думкі аб прыватнасці. Наколькі сёння можна схавацца ад соцыуму, каб пабыць сам-насам з сабой? Паспрабуем разабрацца.

СВЕТ ЗМЯСЦІЎСЯ Ў ДАЛОНІ

Смартфон без перабольшання можна назваць сімвалам інфармацыйнага грамадства. Прыстасаванне, якое дазваляе быць уключаным у глабальны інфармацыйны паток у любым пункце свету, дзе ёсць доступ да інтэрнэту. Хочаш пагаварыць са знаёмымі з Токіа, знаходзячыся на другім канцы свету? Калі ласка! Трэба заказаць што-небудзь з Кітая або Амерыкі? Няма праблем! Гаджэт скарачае час і дыстанцыю не горш за фантастычны касмічны карабель з гіперухавіком, толькі ў межах нашай планеты. І ўсё гэта не казка, гэта тут і цяпер, чым ужо нікога не здзівіш.

СТАР. 4

■ Афіцыйна

ЗАЦВЕРДЖАНЫ ПЛАН ПАДРЫХТОЎКІ ЗАКОНАПРАЕКТАЎ НА 2018 ГОД

Адпаведны ўказ 10 студзеня падпісаў Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка, паведамілі ў прэс-службе беларускага лідара.

У адпаведнасці з планам будуць падрыхтаваны і ўнесены ў Палату прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу трыццаць дзевяць праектаў законаў. Пры гэтым шэсць законапраектаў з'яўляюцца прынцыпова новымі: праекты законаў «Аб плацежных паслугах у Рэспубліцы Беларусь», «Аб персанальных даных», «Аб электраэнергетыцы», «Аб радыяцыйнай бяспецы», «Аб ахове і выкарыстанні балот (тарфянікаў)» і «Аб судова-экспертнай дзейнасці».

Пяць законапраектаў складаюць так званы бюджэтны пакет. У іх ліку праект закона «Аб рэспубліканскім бюджэце на 2019 год».

Астатнія законапраекты прадугледжваюць карэкціроўку дзейнага заканадаўства. Плануецца ўнясенне змяненняў у шэраг кодэксаў, а таксама ў законы «Аб ахове працы», «Аб трансплантацыі органаў і тканак чалавека», «Аб гаспадарчых таварыствах», «Аб геаграфічных указаннях», «Аб аўдытарскай дзейнасці», «Аб дарожным руху», «Аб рэкламе», «Аб натуральных манаполіях», «Аб дзяржаўнай інавацыйнай палітыцы і інавацыйнай дзейнасці ў Рэспубліцы Беларусь», «Аб дзяржаўнай службе ў Рэспубліцы Беларусь» і іншыя.

Акрамя таго, у 2018 годзе будуць падрыхтаваны і ўнесены Прэзідэнту на ўзгадненне дзве канцэпцыі праектаў законаў — «Аб дзяржаўных арганізацыях і гаспадарчых таварыствах з удзелам дзяржавы» і «Аб папярэджанні насілля ў сям'і»

■

ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

ПУЧДЭМОН І РЭСПУБЛІКАНЦЫ КАТАЛОНІІ ДАМОВІЛІСЯ АБ ЯГОНЫМ УСТУПЛЕННІ НА ПАСАДУ КІРАЎНІКА РЭГІЁНА

Былы кіраўнік Каталоніі Карлес Пучдэмон дамовіўся з партыяй «Левыя рэспубліканцы Каталоніі» аб тым, каб паспрабаваць дабіцца свайго ўступлення на пасаду рэгіянальнага лідара пасля парламенцкіх выбараў 21 снежня.

Паводле інфармацыі газеты La Razon, Пучдэмон сустрэўся ў Бруселі з генеральным сакратаром «Левых рэспубліканцаў Каталоніі» Мартай Равіра. Экс-кіраўнік аўтаномнай вобласці, якога іспанская пракуратура вінаваціць у бунце, мяцяжы і растраце, разглядае магчымасць уступлення на пасаду дыстанцыйна або з дапамогай асобы, якая прадстаўляе яго інтарэсы.

Пучдэмон знаходзіцца ў апошнія месяцы ў Бельгіі, бо ў Іспаніі выдадзены ордэр на яго арышт.

27 кастрычніка 2017 года парламент Каталоніі зацвердзіў рэзалюцыю пра абвяшчэнне незалежнай рэспублікі. У адказ Сенат (верхняя палата парламента) Іспаніі ўхваліў просьбу Мадрыда аб увядзенні ў дзеянне 155-га артыкула канстытуцыі каралеўства, якая дазволіла абмежаваць самакіраванне Каталоніі. Пасля гэтага прэм'ер-міністр Іспаніі Марыяна Рахой заявіў, што было прынята рашэнне адхіліць ад пасад Пучдэмона і членаў яго ўрада.

ПРЭЗІДЭНТ МАЛДОВЫ ЛІЧЫЦЬ НЕЗАКОННЫМ СВАЁ ЧАСОВАЕ АДХІЛЕННЕ АД ПАСАДЫ

Ігар Дадон лічыць незаконным сваё часовае адхіленне ад пасады, якое дазволіла старшыні парламента Андрыяну Канду зацвердзіць у сераду ў абход кіраўніка дзяржавы прызначэнні новых членаў кабінета і закон аб забароне тэлеперадач навін з Расіі.

«Прызначаныя сёння міністры не валодаюць неабходнай легітымнасцю», — напісаў прэзідэнт у «Фэйсбуку». На думку Дадона, Дэмакратычная партыя, якая кантралюе парламент Малдовы, можа ўтрымаць уладу ў краіне «толькі шляхам грубага парушэння прынцыпаў дэмакратыі і прававой дзяржавы».

Раней Дадон зацвердзіў адстаўкі ў кабінеце, а новыя прызначэнні ўхваліць адмовіўся, растлумачыўшы сваю пазіцыю «сумнеўнай рэпутацыяй» некаторых кандыдатур.

ПАМЁР МІХАІЛ ДЗЯРЖАВІН

Акцёр Тэатра сатыры, народны артыст РСФСР Міхаіл Дзяржавін памёр ва ўзросце 81 года. Аб гэтым было паведамлена ў сераду на старонцы ў сетцы «Фэйсбук» Маскоўскага акадэмічнага тэатра сатыры.

Па словах жонкі Дзяржавіна Раксаны Бабаян, пахаванне пройдзе, хутчэй за ўсё, у панядзелак, 15 студзеня, на Новадзявочых могілках Масквы. Экс-жонка акцёра Ніна Будзённая расказала, што акцёр пакутаваў ад праблем з сасудамі галаўнога мозга.

Міхаіл Дзяржавін нарадзіўся 15 чэрвеня 1936 года ў Маскве ў сям'і народнага артыста РСФСР, аднаго з вядучых акцёраў тэатра імя Вахтангава Міхаіла Сцяпанавіча і Іраіды Іванаўны Дзяржавіных. Ён скончыў тэатральнае вучылішча імя Шчукіна, потым працаваў у Маскоўскім тэатры імя Ленінскага камсамола, у тэатры на Малой Броннай, а ў 1968 годзе перайшоў у Маскоўскі тэатр сатыры. Запомніліся яго эстрадныя нумары з Аляксандрам Шырвінтам, з якім яны выступалі разам з 1957 года. Акцёры таксама вялі праграмы «Ранішняя пошта» і «Хачу ведаць». У 1956 годзе Дзяржавін дэбютаваў у кіно ў фільме Юрыя Ягорава «Яны былі першыя». Яго фільмаграфія налічвае каля 30 кінастужак. Сярод іх — «Трое ў лодцы, не лічачы сабакі», «Бабнік», «Мая марачка», «Жаніх з Маямі», «Старыя клячы».

Дзяржавін быў тройчы жанаты: з заслужанай артысткай РСФСР, дачкой акцёра Аркадзя Райкіна Кацярынай, дачкой Маршала Савецкага Саюза Сямёна Будзённага Нінай і народнай артысткай Расійскай Федэрацыі спявачкай Раксанай Бабаян.

■ Навуковы падыход

ГАЛОЎНАЯ ПРАДУКЦЫЙНАЯ СІЛА — ЧАЛАВЕК

Што такое наасферная эканоміка і як яна нам дапаможа

Як паскорыць сацыяльна-эканамічнае развіццё краіны? На гэту тэму наш карэспандэнт гутарыць з Пятром НІКІЦЕНКАМ, акадэмікам Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, доктарам эканамічных навук, прафесарам, экспертам Еўрапейскай эканамічнай камісіі ААН па інавацыйным развіцці.

— Пётр Георгіевіч, ход далейшага стратэгічнага развіцця эканомікі нашай краіны, заўважу, у сусветнай супольнасці, дыктуе новыя мэты і арыенціры, неабходнасць рабіць рашучыя крокі наперад. Цяпер такі момант, калі зыходзіць з вынікаў з'езда вучоных, надышоў...

— Многія рэчы і паняцці нам трэба будзе грунтоўна пераасэнсаваць. І ясна ўсвядоміць, што Чалавек з'яўляецца галоўнай прадукцыйнай сілай і носьбітам вытворчых адносін у любой сацыяльна-эканамічнай сістэме, яе мадэлі. А таму стратэгія развіцця эканомікі любой краіны, рэгіёна, прадпрыемства, арганізацыі, індывідуальнага прадпрымальніка вызначаецца першапачаткова і прыярытэтна ўзроўнем і якасцю канцэптуальнай улады чалавечага розуму, светапоглядам, ідэалогіяй і адэкватнай ім кіруючай практычнай дзейнасцю. У свой час слынны палітык прэм'ер-міністр Вялікабрытаніі Уінстан Чэрчыль сказаў: «Імперыі будучыні будуць імперыямі розуму».

— Вы з'яўляецеся стваральнікам Беларускай міжнароднай навуковай школы інавацыйнага і наасфернага ўстойлівага развіцця. Чым наасфера можа быць карысная сёння для нас?

— І не толькі для нас, і не толькі сёння. Цяпер у свеце ўсё часцей звяртаюцца да мадэлі наасфернага ўстойлівага развіцця, якая, прасцей кажучы, уяўляе сабой новую логіку сацыяльна-эканамічных стваральных паводзін чалавека. Між іншым, абгрунтаванне і распрацоўка дадзенай канцэпцыі па даручэнні кіраўніка дзяржавы і кіраўніцтва нашай Нацыянальнай акадэміі навук уваходзіла ў кола нашых пошукаў.

Што такое наасфера? Тэрмін паходзіць з грэчаскай мовы: розум і шар. Гэта сфера ўзаемадзеяння прыроды і грамадства, у межах якой разумная дзейнасць чалавека становіцца галоўным вызначальным фактарам развіцця. Нагадаю, паняцце «наасферы» было прапанавана прафесарам матэматыкі Сарбоны Эдуардам Леруа, які тлумачыў яе як «абалонку, якая фарміруецца чалавечай свядомасцю». На жаль, наасфера застаецца пакуль за межамі свядомага ўключэння ў вытворчыя адносіны, што не дазваляе належным чынам улічваць ролю і ўплыў Розуму і яго носьбіта — Чалавека — у працэсе грамадскага ўзнаўлення, развіцця новых тэхналагічных укладаў. А гэта з'яўляецца сутнасцю наасфернай эканомікі.

— Што варта пачаць неадкладна рабіць з практычнага пункту гледжання, каб выкананне рашэнняў з'езда не зацягвалася?

— Трэба мадэрнізаваць нацыянальную грашовую і крэдытную сістэмы, што дазволіць звесці да мінімуму даўгі прадпрыемстваў і ўзаемныя неплацяжы. Мы сёння маглі б мець і ўласную методыку ацэнкі канкурэнтаздольнасці. На жаль, яе праект у свой час быў адхілены. Цяпер сваю ацэнку па інавацыйным развіцці нашай краіны даюць замежныя фірмы. Зараз мы карыстаемся паслугамі фінансістаў і эканамістаў чужых краін. Гэта насамрэч сур'езная праблема, бо часцяком замежныя рэйтынгавыя бюро працуюць на карысць тых, хто больш іх зацікавіць.

Адзіная падатковая сістэма павінна быць таксама адзінай для грамадзян краін ЕАЭС. Падаткі ўсе працаздольныя грамадзяне абавязаны плаціць аднолькава, але не больш за 1/3 даходу (навастворанага кошту ВУП), незалежна ад месца і сферы працоўнай занятасці. У якасці адной з мер вырашэння праблем у айчыннай эканоміцы прапаную ацаніць назапашанае прыроднае і рукатворнае нацыянальнае багацце (землі, маёмасць і г. д.), уключаючы кошт узнаўлення чалавека. Бо ў Беларусі такой агульнай шкалы ацэнкі не існуе.

На мой погляд, замест паняцця «капітал» неабходна ўвесці катэгорыю «фонды». У іх складзе мэтазгодна ўлічваць не толькі працоўныя рэсурсы і сродкі вытворчасці, але і прыродныя рэсурсы, фінансы, інтэлектуальную ўласнасць, іншае нацыянальнае багацце.

Кожны чалавек мае права ад нараджэння да адыходу ў іншы свет мець у сваёй уласнасці і на індывідуальным банкаўскім рахунку кошт долі рукатворнага і прыроднага багацця, мець закон аб інтэлектуальнай уласнасці, нацыянальны фонд эканамічнай абароны кожнага грамадзяніна не меншы за 1 % ад ВУП. Увогуле чалавек павінен быць гаспадаром на сваёй зямлі. Але гэта варта асобнай вялікай размовы.

— Як вымераць эфектыўнасць працы вучонага?

— Пытанне складанае, няма адназначнага адказу. Напрыклад, можна паглядзець, колькі вучоны напісаў манаграфій і якога кшталту? Якая іх якасць, навізна, тэматычная значнасць? Ці актуальныя яны? Можна ўзяць за пункт адліку ўкараненне вынаходак, навуковых даследаванняў і распрацовак вучонага ў практыку. Безумоўна, у нас умеюць патрабаваць з вучоных. Але хацелася б, каб ім і давалі адпаведна, матывавалі матэрыяльна і маральна іх складаную працу, ствараліўмовы для дзейнасці. Наспелі новыя падыходы па забеспячэнні росту заробкаў работнікаў навуковых арганізацый.

Гэта адзін падыход. Можна прыглядзецца да замежнага досведу. Экс-прэзідэнт Францыі Нікаля Сарказі, які хацеў пабудаваць так званую эканоміку шчасця, заказаў двум лаўрэатам Нобелеўскай прэміі ў галіне эканомікі распрацоўку новых індыкатараў узроўню дабрабыту нацыі. У адрозненне ад традыцыйнага ВУП вучоныя прапанавалі ўлічваць і якасць жыцця. Гаворка пры гэтым ішла не толькі аб паказчыках задаволенасці жыццём у цэлым, але і канкрэтнымі яго характарыстыкамі: узроўнем душэўнага і фізічнага здароўя, збалансаванасцю працы і сямейнага жыцця. Цікавае даследаванне, на мой погляд.

На маю думку, варта стварыць па прыкладзе Швейцарыі фонд нацыянальнай эканамічнай бяспекі ў памеры аднаго працэнта ВУП з штомесячнай безпадаткавай выплатай з яго сумы кожнаму жыхару Беларусі з нараджэння. Беларуская мадэль развіцця мае ўсе падставы крэатыўна выкарыстоўваць такі падыход.

— Як наасферная эканоміка будзе ўплываць на паказчыкі рэальнай эканомікі, напрыклад рост валавога ўнутранага прадукту?

— Разам з чалавечым інтэлектам узрастае роля розуму. Адсюль і адметная рыса наасфернай эканомікі — рост навукаёмістасці ВУП і рэалізацыя як прыярытэтнай патрэбы чалавека ў бесперапыннасці адукацыі на аснове засваення цалкам новых планетарных ведаў. Навукаёмістасць ВУП усё больш будуць забяспечваць прафесіяналізм і якасць працоўных рэсурсаў. Аднак сфера розуму — наасфера, застаецца, як я ўжо казаў, пакуль за межамі ўсвядомленага ўключэння ў нанатэхналагічныя прадукцыйныя сілы і вытворчыя адносіны, а таму не разглядаецца ў якасці галоўнага палітыка-эканамічнага субстанцыянальнага фактару. Таму асновы наасферы варта выкладаць у нашых ВНУ, а пачынаць знаёмства з ёй трэба ўжо ў сярэдняй школе. Павінен мець месца сістэмны падыход у гэтай справе. У наасфернай мадэлі сацыяльна-эканамічнага развіцця павінна ўлічвацца і падлічвацца не толькі праца ў сферы матэрыяльнай вытворчасці, але і дзейнасць у сацыяльнай сферы, навуцы, адукацыі, ахове здароўя, культуры, мастацтве, спорце, рэлігіі і іншых відах дзейнасці. Гэта прынцыпова важна ўсвядоміць і зразумець усім, асабліва кіруючым кадрам.

Бо па прынцыповых пытаннях развіцця навукі, узмацнення яе сувязі з вытворчасцю моцных разыходжанняў у дыскусіях вучоных я не заўважыў. Але звярніце ўвагу на тое, што тыя пазіцыі і кірункі дзейнасці, якія 10 гадоў назад толькі агучваліся, нараджаліся, заяўляліся, цяпер ужо рэальнасць. Напрыклад, тады толькі пачыналі казаць пра скразную лічбавізацыю эканомікі, стварэнне IT-краіны, чацвёртую прамысловую рэвалюцыю, штучны інтэлект, развіццё эканомікі ведаў, рабатызацыю. Сёння гэта асноўныя кірункі навуковай дзейнасці, кампаненты будучай эканомікі нашай краіны.

Возьмем лічбавую эканоміку. Той, хто ёй авалодае на належным узроўні, будзе ў ліку лідараў вызначаць прыярытэты развіцця для іншых краін і кантынентаў. Лічбавая эканоміка і інтэрнэт-тэхналогіі становяцца аб'яднаўчым базавым тэхналагічным рэсурсам сусветнай эканомікі і ўсёй жыццядзейнасці людзей на планеце. І чалавечы патэнцыял, інтэлект тут выходзяць на першае месца.

Гутарыў Леанід ЛАХМАНЕНКА

■

ЭПІДЭМІІ ГРЫПУ НЕ ЧАКАЕЦЦА

У гэтым сезоне цыркулююць вірусы грыпу, блізкароднасныя мінулагоднім. Таму і ў перыяд пад'ёму захваральнасці — а пачынаецца ён у канцы студзеня — пачатку лютага — большай колькасці пацыентаў, чым летась, не чакаецца, паведаміла кіраўнік Нацыянальнага цэнтра па грыпе Наталля ГРЫБКОВА.

А ў апошнія тыдні ў Беларусі ўвогуле назіраецца зніжэнне ўзроўню вострых рэспіратарных інфекцый. Спецыялісты звязваюць гэта з навагоднімі святамі і канікуламі, падчас якіх змяншаецца колькасць кантактаванняў.

— На вострыя рэспіратарныя інфекцыі зараз больш хварэюць дзеці, — адзначыла **намеснік начальніка аддзела гігіены, эпідэміялогіі і прафілактыкі Міністэрства аховы здароўя Іна КАРАБАН.** — Але ў найбліжэйшы час чакаем невялікага пад'ёму ВРЗ, бо ў школьнікаў скончыліся канікулы.

Пакуль рэгіструюцца адзінкавыя выпадкі грыпу. І такую станоўчую тэндэнцыю спецыялісты звязваюць з актыўнай імунізацыяй. Прышчэпкі супраць грыпу ў сезоне 2017/2018 года атрымалі 40,5 % жыхароў Беларусі. Пры гэтым у групах рызыкі прышчэплена больш за 75 %, што адпавядае рэкамендацыям Сусветнай арганізацыі аховы здароўя. Таксама прышчэпкі атрымалі больш за палову дзяцей ва ўзросце ад 3 да 6 гадоў і амаль 55 % школьнікаў.

Як паведаміла Іна Карабан, пра эфектыўнасць сёлетняй імунізацыі можна будзе гаварыць пасля сезоннага пад'ёму захваральнасці. А вось вынікі леташняй кампаніі па імунізацыі вельмі красамоўныя. У прыватнасці, удалося папярэдзіць больш за 145 тысяч захворванняў на грып і больш за 200 тысяч выпадкаў ВРІ негрыпознай этыялогіі. Дзякуючы імунізацыі апошнія некалькі гадоў у Беларусі эпідэмій грыпу не фіксавалася.

Як адзначыла спецыяліст, вакцыны ўсіх вытворцаў вырабляюцца згодна з рэкамендацыямі Сусветнай арганізацыі аховы здароўя, таму не маюць адрозненняў. Тыя катэгорыі насельніцтва, якія рабілі прышчэпкі за кошт мясцовых і рэспубліканскага бюджэту, атрымлівалі вакцыну расійскай вытворчасці. Добра сябе зарэкамендавалі таксама французскія, бельгійскія, кітайскія, індыйскія вытворцы, іх вакцыны выкарыстоўвалі прадпрыемствы і арганізацыі, а таксама грамадзяне, якія рабілі прышчэпку за ўласны кошт.

Алена КРАВЕЦ. *kravets@zviazda.by*

У тэму

КАЛІ НЯМА ПРЫШЧЭПКІ

Перыяд імунізацыі завяршыўся ў пачатку снежня. Тым, хто не зрабіў прышчэпку, трэба выконваць некалькі простых рэкамендацый, каб знізіць рызыку інфіцыравання.

Як падкрэсліў **галоўны пазаштатны спецыяліст Міністэрства аховы здароўя па інфекцыйных хваробах Ігар КАРПАЎ,** наш імунітэт стымулююць умераныя фізічныя нагрузкі і здаровае харчаванне, багатае на вітаміны. Не пашкодзяць у гэты час і вітамінныя комплексы, загартоўванне. Праўда, пачынаць апошняе трэба не зімой, а ў маі, калі становіцца цяплей, і праводзіць яго рэгулярна.

Важна прытрымлівацца рэспіратарнага этыкету: з сімптомамі хваробы лепш заставацца дома і мінімізаваць на гэты час колькасць кантактаў. Перад выхадам з дома можна змазваць насавыя хады аксалінавай ці іншай падобнай маззю, каб папярэдзіць пранікненне віруса. Трэба памятаць, што вірус любіць сухую слізістую, таму пажадана ў такі час увільгатняць нос фізрастворам.

Што датычыцца дзяцей, то тут важна не перагружаць іх, уцяпляючы па максімуме. Спецыялісты не даюць адназначных ацэнак на карысць разнастайных імунамадулятараў. На іх думку, дадатковыя лекавыя нагрузкі ў гэты перыяд шкодзяць здароўю.

■ Размова па сутнасці

Няпросты 1918-ы

«1918-ы для нашай дзяржаўнасці: набыткі і страты». Круглы стол з такой назвай адбыўся ўчора ў рэдакцыі «Звязды». Аналізуючы падзеі стагадовай даўнасці, яго ўдзельнікі — вядомыя гісторыкі і грамадскія дзеячы — шукалі адказы на пытанні: якія перадумовы былі сто гадоў назад для практычнай рэалізацыі беларускай нацыянальнай дзяржаўнасці? Ці можна сказаць, што ў той час ужо існавала беларуская нацыянальная эліта? Ці была нацыянальная свядомасць большасці насельніцтва на тым узроўні, каб зразумець і прыняць неабходнасць уласнай дзяржавы? Як уплывалі акупацыйныя ўлады на дзяржаўныя памкненні беларусаў? Стварэнне Беларускай Народнай Рэспублікі было парывам летуценнікаў, адарваных ад рэальнасці, ці важным крокам для ўтварэння самастойнай беларускай дзяржавы?

Размова атрымалася цікавая і змястоўная. Яе падрабязны пераказ у хуткім часе будзе апублікаваны ў «Звяздзе» і на нашым сайце. Не прапусціце!

■

■ Фінансы

ЮРАСОБАМ — БЕЗ АБМЕЖАВАННЯЎ

Нацыянальным банкам прынята рашэнне аб адмене абмежаванняў па мэтавай куплі замежнай валюты юрыдычнымі асобамі і індывідуальнымі прадпрымальнікамі.

Так, юрыдычныя асобы-рэзідэнты змогуць ажыццяўляць куплю замежнай валюты па неабходнасці, якая вызначаецца імі самастойна. Не ўстанаўліваюцца таксама тэрміны выкарыстання набытай замежнай валюты. Аналагічны парадак здзяйснення валютна-абменных аперацый будзе дзейнічаць і для індывідуальных прадпрымальнікаў.

У адпаведнасці з новай інструкцыяй пры куплі замежнай валюты юрыдычныя асобы і індывідуальныя прадпрымальнікі абавязаны будуць паказваць код кірунку выкарыстання замежнай валюты. Пры гэтым пазначэнне гэтых кодаў будзе насіць выключна статыстычны характар і не будзе абмяжоўваць выкарыстанне набытай замежнай валюты па іншых кірунках.

Адмена абмежаванняў па мэтавай куплі валюты і ўсталяванне аднолькавага парадку правядзення валютна-абменных аперацый з удзелам юрыдычных асоб і індывідуальных прадпрымальнікаў забяспечаць большую свабоду прадпрымальніцкай дзейнасці. Акрамя таго, гэта дазволіць знізіць адміністрацыйныя выдаткі суб'ектаў гаспадарання, звязаныя з неабходнасцю звароту ў Нацыянальны банк па атрыманне дазволаў на куплю замежнай валюты на мэты, не прадугледжаныя заканадаўствам, падаўжэнне тэрмінаў захоўвання і змяненне мэтавага выкарыстання набытай замежнай валюты.

Адмена абмежаванняў па мэтавай куплі замежнай валюты для юрыдычных асоб стане дадатковым крокам у напрамку гарманізацыі валютнага заканадаўства ў рамках Еўразійскага эканамічнага саюза і сфарміруе перадумовы для наступнай адмены іншых абмежаванняў і абцяжараняў, устаноўленых валютным заканадаўствам Беларусі.

Каментарый старшыні Асацыяцыі беларускіх банкаў Аляксандра КУЧЫНСКАГА.

— Што прыняцце гэтага рашэння зменіць у дзелавым асяроддзі і чаго можна чакаць у будучыні?

— Мы бачым, што меры, накіраваныя на лібералізацыю валютнага заканадаўства, будуць прымацца і далей. Што датычыцца самой інструкцыі з нагоды валютна-абменных аперацый, то гэта ў агульнай канве накіравана на разняволенне дзелавой актыўнасці і зняцце залішніх мер рэгулявання ў пэўных сферах дзейнасці. А гэта будзе спрыяць таму, што юрыдычныя асобы і прадпрымальнікі будуць больш вольныя ў прыняцці рашэнняў. Цяпер рашэнні (што датычыцца набыцця замежнай валюты) яны будуць прымаць самастойна. І ў далейшым мы чакаем, што дзеянні галоўнага рэгулятара будуць накіраваныя на разняволенне дзелавога асяроддзя для таго, каб актывізаваць актыўнасць нашых суб'ектаў гаспадарання.

Сяргей КУРКАЧ. *kurkach@zviazda.by*

■

■ Гарадская гаспадарка

«Жыхары самі просяць арганізаваць платную паркоўку каля дома»

Як у сталіцы вырашаюць праблему з паркінгамі

Ні для кога не сакрэт, што пытанне, дзе пакінуць аўтамабіль, як у дварах, так і на цэнтральных вуліцах вялікага горада, асабліва сталіцы, стаіць вельмі востра. Адзін са спосабаў яго рашэння — ўкараненне па ўсім горадзе сістэмы платных парковак. Зараз у Мінску каля 2,5 тысячы прызначаных для гэтага машына-месцаў, але ўжо да 2020 года профільныя службы абяцаюць павялічыць іх колькасць у 10 разоў.

Зараз жа платныя паркоўкі сканцэнтраваныя ў раёнах Прывакзальнай плошчы, станцыі метро Якуба Коласа, Старога горада. У будучыні іх без цяжкасцяў можна будзе знайсці па ўсім перыметры ўнутры Другога кальца. Як адзначыў **старшыня Беларускай асацыяцыі экспертаў і сюрвееraў на транспарце Юрый ВАЖНІК,** сістэма патрэбна ў першую чаргу для рэгулявання сітуацыі з занадта вялікай колькасцю аўтамабіляў, а не для атрымання прыбытку. Да таго ж грошы, зароблены такім чынам, пойдуць на паляпшэнне гарадскога асяроддзя: ад стварэння новых парковачных месцаў да забеспячэння безбар'ернага асяроддзя і веладарожак.

Як паказвае практыка, увядзенне платы за стаянку да лепшага мяняе сітуацыю з яе даступнасцю і бяспекай. У сувязі з гэтым жыхары бліжніх дамоў нярэдка самі звяртаюцца да гарадскіх службаў з просьбай абсталяваць непадалёк платную паркоўку. Аднак гэтая тэма мае два бакі: актуальным становіцца пытанне абароны двароў жылых дамоў, куды часцей за ўсё спрабуюць перамясціцца тыя, хто не жадае расставацца з грашыма.

Фота БЕЛТА.

Для кантролю за добрасумленнасцю аўтамабілістаў выкарыстоўваюць розныя спосабы. Па словах **дырэктара ДУ «Паркоўкі сталіцы» Алега ЛЯШЧЫНСКАГА,** цяпер у раёне вуліцы Варанянскага апрабуецца новая сістэма. Там усталяваныя відэакамеры, якія фіксуюць знаходжанне аўтамабіля на паркоўцы па рэгістрацыйных знаках. З канца снежня праводзіцца работа па інфармаванні жыхароў бліжніх двароў аб новаўвядзенні, ствараецца база ўладальнікаў аўтамабіляў. Каб усім было зручна, плату за паркоўку не мясцовым жыхарам трэба будзе ўносіць толькі калі яны пакінуць на ёй свой аўтамабіль у перыяд з 8 да 20 гадзін у будныя дні. Падобная сістэма ўжо зарэкамендавала сябе ў раёне бульвара Мулявіна, дзе, напрыклад, прадугледжаны спецыяльныя ўмовы для бацькоў, якія прывозяць дзяцей у дзіцячы сад.

Што датычыцца тых, хто спрабуе скарыстацца паслугамі парковак бясплатна, усе яны занесеныя ў базу. Калі парушэнні паўтараюцца шматразова, справа можа дайсці да суда. Тыя ж, хто проста не разабраўся з сістэмай або забыўся ўнесці аплату, суровай кары могуць не баяцца — іх проста папросяць унесці яе пазней.

Як расказалі спецыялісты, сярэдні тэрмін акупнасці платных парковак у сталіцы каля 1,5 года. На дадзены момант іх колькасць у сталіцы складае 39, але плануецца, што ўжо да канца года яна павялічыцца да 70.

Дар'я КАСКО. *kasko@zviazda.by*

■

■ Занятасць

Вакансій большае

А афіцыйны ўзровень беспрацоўя працягвае зніжацца

На пачатак студзеня ў краіне зарэгістравана 22,8 тысячы беспрацоўных — гэта 0,5 працэнта ад эканамічна актыўнага насельніцтва. Апошні раз такі нізкі ўзровень назіраўся ў 2014 годзе.

Колькасць незанятых грамадзян скарачалася пачынаючы з сакавіка (тады на біржы налічвалася 43 тысячы беспрацоўных). А вось прапаноў ад наймальнікаў стала больш — цяпер у краіне адкрыта 53,8 тысячы вакансій.

Работа дзяржаўных службаў занятасці стала больш эфектыўнай. Калі ў 2016-м з іх дапамогай знайшлі работу 55 працэнтаў грамадзян, што звярталіся па садзейнічанне ў працаўладкаванні, то ў 2017-м — 61 працэнт.

Наталля ЛУБНЕЎСКАЯ. *lubneuskaya@zviazda.by*

■

ТУРЫСТЫЧНА ПРЫВАБНЫЯ... КАМЯНІ

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Руіны клічуць

Не вялікі сакрэт, што агромністая колькасць магчымых турыстычных аб'ектаў знаходзіцца ў стане занядбання. Павел з ходу называе некалькі прыкладаў з розным падыходам да турыстычнага патэнцыялу мясціны. Так, у Мінску знаходзіцца музей валуноў — унікальны аб'ект, адзін з нямногіх у Еўропе. З камянёў выкладзена вялізная карта Беларусі з рэкамі-дарожкамі, з геаграфічна дакладна перададзенымі ўзвышшамі і азёрамі, валунамі, што былі спецыяльна прывезеныя з розных рэгіёнаў як помнікі прыроды і гісторыі. Фактычна музей уяўляе парк пад адкрытым небам, ён мог бы прыносіць вялікую карысць — фінансавую ў тым ліку, таму што дазваляе масавае наведванне. Пакуль што да мясціны нават не прымацаваны пастаянны экскурсавод, аднак зусім нядаўна з'явіліся шыльды-ўказальнікі, што радуе.

Мястэчка Сёмкава сёння знаходзіцца на раздарожжы. Першы кірунак развіцця паўтарае лёс чарговага населенага пункта з мноствам катэджаў. Але пры ўдалых абставінах іншы падыход ператворыць мясціну ў гісторыка-культурны аб'ект.

Як прызнаюцца некаторыя экскурсаводы, мала што можна паказаць групе турыстаў у Лагойску. Горад захаваў замкавыя валы, руіны сядзібы, храм і прыгожую рэчку Гайну, аднак гэта хутчэй аскепкі мінуўшчыны. Ёсць меркаванне, што для турыста, асабліва замежнага, трэба больш відовішчаў. Тым не менш Лагойск — прыклад хутчэй станоўчы. Мясцовыя ўлады падтрымалі арганізацыю навуковых канферэнцый «Чытанні Тышкевічаў», а экскурсаводы падчас аглядных экскурсій выкарыстоўваюць прыём аднаўлення: з дапамогай фотаздымкаў і апісання на словах «дамалёўваюць», як выглядаў аб'ект да разбурэння.

— Ці паказваць турысту руіны — пытанне спрэчнае, — прызнаецца Павел. — З аднаго боку, аб'екты знаходзяцца ў непрывабным, незаконсерваваным стане і абнаўленне не плануецца ў найбліжэйшы час. Аднак яшчэ ў XIX стагоддзі з'явілася цяга да напаўразбураных замкаў з іх загадкавым і рамантычным выглядам. Я лічу, што ў нашай сітуацыі няма патрэбы дабудоўваць помнік нягледзячы ні на што. На мой погляд, трэба шукаць нейкі шлях для захавання спадчыны: пры магчымасці — кансерваваць помнікі, прыстасоўваць іх да турыстычных патрэб з улікам магчымасцяў і са згоды Міністэрства культуры. Напрыклад, Гальшанскі замак пакуль у стане руін, але там праводзіцца праца, ёсць ідэя стварыць унутры экспазіцыю.

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Поўнае паглыбленне

Цікавасць да гістарычнай спадчыны ў грамадстве паступова расце. Пра гэта сведчыць Фэст экскурсаводаў, які займеў вялікую папулярнасць.

Афіцыйна экскурсіі можа праводзіць той чалавек, які мае пасведчанне экскурсавода. Але ў вёсках і перыферыйных гарадах жывуць аматары-краязнаўцы, і іх дзейнасць у многім сугучная рабоце «прафесійных» калег. Людзі збіраюць матэрыял па сваёй мясцовасці, часта захоўваюць калекцыі ці арганізуюць школьныя музеі. Адна з турыстычных плыняў прытрымліваецца пазіцыі, што экскурсіі па рэгіянальных славутасцях павінны праводзіць рэгіянальныя гіды. Здараліся непрыемныя выпадкі, калі турыстычная фірма некалькі разоў прасіла мясцовага краязнаўца правесці экскурсію, а потым выкарыстоўвала яго тэксты, толькі ўжо ў падачы свайго работніка.

— Я лічу, што мясцовыя гіды лепш ведаюць тэму, бо тут, як правіла, гаворка ідзе пра захопленых гісторыяй малой радзімы людзей, якія «хварэюць» за справу і глыбока вывучаюць пытанне. Адпаведна, змогуць цікава і падрабязна адказаць на пытанні, у адрозненне ад чалавека, які проста механічна завучыў маршрут і тэкст. Пытанне ўзнікае ў тым выпадку, калі за вандроўку мясцовы гід бярэ грошы. Тады трэба афармляць дзейнасць як аказанне турыстычных паслуг і адказваць за іх якасць, — гаворыць экскурсавод.

Павел Каралёў адзін з распрацоўшчыкаў маршруту «Мінскае кола». Туды ўваходзяць аб'екты, да якіх турыст спецыяльна наўрад ці паедзе — гэта Прылукі, Сёмкава, Лагойск, Дукора, Смілавічы. Нібы пояс з сядзіб вакол Мінска. Праехаўшы па маршруце, турыст атрымлівае панараму шляхецкага жыцця XIX стагоддзя: даведваецца, як жылі гаспадары маёнткаў, чым займаліся, які ўнёсак рабілі ў культуру. Арганізатары праекта лічаць, што «колы» здольны стварыць брэнд для кожнага рэгіёна. Турыст аказваецца поўнасцю захоплены вандроўкай, і гэта пакідае ў памяці больш яркае ўражанне, чым складзеная з некалькіх тэматык экскурсія. Ідэя «Мінскага кола» даволі маладая. На Гомельшчыне падобны праект ужо дастаткова вядомы, а з 2005 года ўзнікла прапанова на стварэнне «Залатога кола Беларусі».

Часта турыстычныя фірмы пагаджаюцца «перакроіць» маршрут згодна з пажаданнямі групы. Мяняюцца не толькі месцы наведвання, але і час знаходжання. З аднаго боку, гэта не вельмі прыемная практыка для музеяў, калі экскурсавод павінен паказаць экспазіцыю за паўгадзіны. З другога — штуршок да новых формаў падачы матэрыялу, каб за кароткі час зацікавіць наведвальніка тэмай. З гэтай працай выдатна спраўляюцца аніматары.

Напрыклад, тэатральнымі элементамі аздоблена падарожжа «Краіна замкаў». Многія мясцовыя арганізатары стараюцца ўключыць у агляд славутасцяў пэўныя элементы відовішча.

Паездка ў Сярэднявечча

— Першае, што я параіў бы мясцовым энтузіястам — гэта прапаноўваць ідэі. Калі ёсць матэрыяльная спадчына, то чаму б не прысвяціць ёй фестываль, імпрэзу, падняць і рэканструяваць свае традыцыі? Такім чынам атрымаецца «карцінка», якую падхопіць прэса і тэлебачанне. Другі важны складнік у турыстычным развіцці звязаны з падтрымкай ад мясцовых улад, — разважае Павел Каралёў. — Апошнім часам на Беларусі ўзнікаюць фестывалі, прысвечаныя нейкай мясцовай славутасці. І тут мы сутыкаемся з пытаннем падачы. У нас яшчэ засталося рэха савецкага мыслення пра «абавязковую частку праграмы» з выступоўцамі і канцэртам мясцовых калектываў на сцэне. У выніку няма ніякага адрознення ад суседзяў, арыгінальнасці. Вельмі хацелася б у такой справе даць волю людзям з нестандартным мысленнем.

На пачатку 2000-х гадоў некаторыя беларускія гарады з багатай гістарычнай спадчынай ладзілі рыцарскія фестывалі розных маштабаў. Сёння найбольш знакамітым і буйным рыцарскім фэстам застаецца «Наш Грунвальд» у Дудутках, але многа дзе распачаты «сярэднявечны» рух сам сабою счэз. Вядома, рыцарскія клубы ўсё часцей прысутнічаюць у святочных праграмах, але хутчэй як адзін са складнікаў.

— Хацелася бачыць горад, які сур'ёзна развіваў бы тэму рыцарства, запрашаў рэканструктараў, аматараў старажытнай музыкі, танцавальныя гурты, ладзіў бы не часовыя выступы клубаў, а мэтанакіравана падтрымліваў і ўзбагачаў гэты турыстычны кірунак. Пакуль што ў згаданым напрамку рухаюцца энтузіясты з Ліды, толькі ім яшчэ не хапае маштабу. А між тым падобныя мерапрыемствы, бадай, самы дзейсны спосаб азірнуцца ў мінулае, на эпоху Сярэднявечча, і нейкі час пажыць у яго рамантычнай версіі. Музыка, строі, гульні, турніры — дастатковыя прычыны, каб захапіцца даўніной.

Рагнеда ЮРГЕЛЬ.
yurgel@zviazda.by

АСЦЯРОЖНА: МАБІЛЬНЫ ШПІЁН

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Страціць смартфон — азначае выпасці з жыцця. І часам страта самога гаджэта палохае менш, чым страта даных на ім. Бо там можа знаходзіцца ўсё — ад асабістай перапіскі і да прывязанай плацежнай карткі. Дзякуючы мноству датчыкаў, якія дазваляюць арыентавацца ў прасторы і аналізаваць інфармацыю вакол вас, ён робіць жыццё прасцейшым. Настолькі прасцейшым, што, калі вы трапляеце ў незнаёмы горад дзе-небудзь на іншым канцы свету, вам не патрэбен гід. Ваш тэлефон вам раскажа, куды варта схадзіць, як туды дабрацца, і нават паспрабуе знайсці вашых сяброў з сацыяльных сетак паблізу.

Але, калі падумаць, такая зручнасць трохі палохае. Смартфон не толькі ведае пра тое, дзе вы цяпер, але і пра тое, дзе вы былі роўна год таму ў гэты дзень і ў гэтую ж гадзіну. Ва ўліковым запісе гаджэта пад кіраваннем Android ёсць укладка «Храналогія», якая паказвае, дзе, калі і як доўга вы былі ў тым ці іншым месцы. Вы скажаце, што можна адключыць доступ тэлефона да вызначэння геалакацыі, але гэта не зусім так. У лістападзе мінулага года кампанія Google прызналася, што збірае праз смартфоны пад кіраваннем сістэмы Android звесткі пра месцазнаходжанне карыстальнікаў нават тады, калі яны таго не жадаюць. Гэта адбывалася нават пры ўмове адключэння геалакацыі і адсутнасці sim-карты. Акрамя таго, калі вы «гугліце», гісторыя пошуку застаецца не толькі ў камп'ютары, але і апрацоўваецца серверам кампаніі, што вывучае вашы густы і накіроўвае на вас рэкламу з рэчамі, якія вам «будуць цікавыя». Калі вы набіраеце запыт у пошуку, Google не проста шукае тое, што вы хочаце знайсці, але і прадбачыць ваш запыт. Праграмныя алгарытмы кампаніі дазваляюць апрацоўваць мільярды запытаў і разумець, што менавіта хоча сярэднестатыстычны карыстальнік яшчэ да таго, як ён скончыць запыт.

Да смартфона часта прывязаныя ўліковыя запісы сацыяльных сетак з усёй інфармацыяй пра вас. Гэта таксама дазваляе таргетаванай рэкламе знаходзіць свайго магчымага спажыўца адразу ў сацсетцы. У прадаўца ў літаральным сэнсе ёсць доступ да псіхалагічнага партрэта пакупніка і магчымасць прамой сувязі з ім. Акрамя таго, у гаджэце ёсць мікрафон, здольны распазнаваць словы і складаць іх у тэкст. Карыстальнікі заўважалі, што калі доўга размаўляць ля гаджэта нават у пасіўным стане пра пэўны тавар, то часта ў сацсетках можна атрымаць прапановы з тым, пра што вы так часта гаварылі.

Смартфон змяшчае ў сабе ўсё неабходнае начынне, якое дазваляе адсачыць нават тое, што вы друкуеце на клавіятуры камп'ютара, калі ён знаходзіцца з ёй на адной паверхні. Таксама алгарытмы распазнання асобы сёння настолькі дасканалыя, што здольныя распазнаць любога чалавека, які стаіць перад вамі, па фота. Праграма для смартфона FindFace здольна па адной толькі фатаграфіі знайсці чалавека ў сацыяльнай сетцы! Дык для зручнасці гэта зроблена ці «Вялікі Брат глядзіць на нас»?

ЗБЕГЧЫ АД РАДАРАЎ

Атрымліваецца, што наша жыццё пад пастаянным назіраннем. У некаторых людзей нават ёсць звычка заклейваць пярэднюю камеру сваіх гаджэтаў. **Былы супрацоўнік Агенцтва нацыянальнай бяспекі ЗША Эдвард СНОЎДЭН** параіў рабіць гэта, каб засцерагчы сябе ад кіберсачэння. Вы не зламыснік і думаеце, што спецслужбам усяго свету няма да вас справы? Добра, але ёсць хакеры, якім цікава падгледзець за кімсьці ў самы нязручны для чалавека час праз вэбкамеру. Умелец, можа, нават зрабіць праз гэту камеру на адлегласці некалькі вашых фота ў негліжэ, а потым паспрабаваць прадаць вам іх. Расійскі хакер нават стварыў падобны анлайн-сэрвіс, дзе трансляваў жыццё сваіх ахвяр, якія пра гэта нават не падазравалі, у прамым эфіры.

Якія даныя сёння здольны збіраць смартфон? Авал твару, будова сятчаткі вока, пульс, адбіткі пальцаў, тэмбр голасу — усё тое, што робіць чалавека ўнікальным. Дадайце сюды псіхалагічны партрэт у сацыяльнай сетцы, месцы, дзе мы бываем, нашы жаданні і думкі, якімі мы дзелімся з Google, перапіску і графік жыцця. Няма нічога, аб чым бы не маглі ведаць тыя кампаніі, якія працуюць з інфармацыяй. І ўжо не патрэбен ніякі чып, які б ужыўлялі ў чалавека, каб за ім сачыць. Ёсць смартфон — няма прыватнасці.

Паўстае пытанне: а як жа схавацца ад назірання, калі хочацца пабыць сам-насам з сабой? Проста пазбавіцца ад смартфона і перайсці на звычайны старэнькі тэлефон, які толькі і ўмее, што тэлефанаваць? Магчыма, але там ёсць sim-карта, па якой вас можна трыянгуляваць з вельмі вялікай дакладнасцю. Вам давядзецца пазбавіцца і ад пластыкавай карткі, разлічвацца толькі наяўнымі. Давядзецца не карыстацца камп'ютарам, бо спосаб і хуткасць набору на клавіятуры таксама ўнікальныя і па ім можна зразумець, хто працуе за маніторам. Таксама трэба будзе ўбудаваць у шапку інфрачырвоныя лямпы, каб яны бянтэжылі камеры назірання, якія будуць распазнаваць ваш твар. Змяніць прычоску таксама рэкамендуецца. І не забывайцеся пра адбіткі пальцаў — з імі таксама трэба нешта зрабіць. Акрамя таго, чалавек, які ўсё гэта збіраецца рабіць, будзе выглядаць недарэчна, што таксама прыцягне да сябе ўвагу. Гэта наводзіць на адну думку: па-сапраўднаму знікнуць з соцыуму, адмовіўшыся ад смартфона і гаджэтаў, ужо не атрымаецца. З кожным годам чалавек усё далей ад прыватнасці. Яшчэ не так даўно на форумах у інтэрнэце жартавалі пра тое, што за афлайн хутка прыйдзецца плаціць. Сёння гэта ўжо нават не смешна. Дый ці жарт гэта цяпер?

Ілья КРЫЖЭВІЧ.
kryzhevich@zviazda.by

Сямейная газета

Выпуск №1 (92)

НАТХНЕННЕ ДЛЯ МАМЫ

У майго сябра было небагатае дзяцінства. Жылі ў двухпакаёвай кватэры ўчатырох. Таму хлопчыку даводзілася дзяліць пакой з бабуляй. Яго, прызнаўся, гэта зусім не напружвала, хутчэй наадварот. Праўда, была адна нязручнасць. Бабуля рана клалася спаць і, вядома, выключала святло. Уладзік спачатку рабіў выгляд, што таксама спіць. Але як толькі бабуля засынала, залазіў з ліхтарыкам пад коўдру і вандраваў разам з Пітэрам Пэнам, Маленькім прынцам, Рабінзонам Круза...

Я таксама, колькі сябе памятаю, вельмі любіла чытаць. Што цікава, з узростам цікавасць да казачных гісторый не знікла. З кожнага заробку набываю якую-небудзь новую дзіцячую кнігу. І працягваю вучыцца дабрыні.

У нядзелю я села пісаць калонку ў газету. Але, як гэта часам здараецца, нічога добрага не атрымлівалася. Тады вырашыла перачытаць казку Надзі Букі пра Басю і Пігласа. Там ёсць цудоўны момант пра натхненне.

Дзяўчынка захацела намаляваць Пігласа (казачны герой у выглядзе вока). Але партрэт ніяк не атрымліваўся. Бася вырашыла падзяліцца сваім горам з мамай. Але, калі зайшла ў пакой, убачыла, што тая сядзела за сталом і разгублена глядзела ў манітор ноўтбука.

— Мама, што ты робіш? — пацікавілася Бася.

— Шукаю натхненне...

Бася, якая таксама шукала натхненне, падумала: «Няхай у мяне сёння не атрымаецца партрэт, каб толькі натхненне завітала да мамы».

І толькі яна так падумала, як пакой напоўніўся бурбалкамі. Піглас сеў маме на плячо. Яна зрабіла глыток кавы і пачала хутка нешта друкаваць. Бася вярнулася ў свой пакой, узяла ў рукі аловак. У гэты момант Піглас сеў ёй акурат на галаву. Партрэт атрымаўся адзін у адзін.

Яшчэ ў цяжкія моманты мяне вельмі натхняе гісторыя пра марскія зоркі.

Чалавек ішоў па беразе і раптам убачыў хлопчыка, які падымаў штосьці з пяску і кідаў у мора. Гэта былі марскія зоркі.

— Навошта ты кідаеш іх у ваду?

— Яны загінуць, калі застануцца на беразе да заўтрашняй раніцы, бо пачнецца адліў, — адказаў хлопчык, не спыняючы свайго занятку.

— Але азірніся, тут мільёны марскіх зорак, думаеш ты можаш штосьці змяніць?

Хлопчык падняў наступную зорку, кінуў яе ў мора і сказаў:

— Так, я магу змяніць вельмі шмат... для гэтай зоркі.

Улетку я часта працую ў ціхім дворыку непадалёк ад рэдакцыі. Менавіта там і пазнаёмілася з Паўлікам. Хлопчык з заклапочаным выглядам капаў палачкай маленькія ямкі. «Што ты робіш?» — не змагла стрымаць я сваёй цікаўнасці. — «Шукаю батарэйкі, якія выкідваюць дарослыя». (І паказаў дзве свежыя знаходкі.) Яны атручваюць зямлю. Я вырашыў выратаваць наш двор».

Але больш за ўсё мяне ўразіла мудрасць дачкі маёй знаёмай мастачкі. Ксюша зараз вучыцца ў пятым класе і змалку разам з мамай практыкуе Фалуньгун (сістэма самаўдасканальвання), які вучыць ісціне, дабрыні ды цярпенню.

— Мая Ксюша вельмі творчая дзяўчынка, любіць маляваць, — расказала мне за абедам Каця. — І ёй, як і большасці гуманітарыяў, цяжка даюцца фізіка ды матэматыка. Аднойчы ўвечары дачка рабіла дамашняе заданне і не магла рашыць нейкую складаную задачу. Папрасіла тату дапамагчы. Праз некалькі хвілін я пачула крыкі мужа. Ён моцна раззлаваўся на Ксюшу, бо тая, відаць, ніяк не магла зразумець яго тлумачэнні. Я на эмоцыях заступілася за дачку, павысіла голас на мужа. Пасля, калі ўсе супакоіліся і тысячу разоў пашкадавалі пра сварку, я запыталася ў Ксюшы, чаму яна нават не заплакала?

— Мама, таму, хто злуецца і крычыць, яшчэ цяжэй, чым таму, на каго крычаць. Калі б я заплакала, тату было б яшчэ горш.

Надзея ДРЫНДРОЖЫК.

nadzieja@zviazda.by

■ Тыя, хто побач

«ЛЮБЛЮ ДАРЫЦЬ ЖОНЦЫ КВЕТКІ»

Зорны тата Саша НЭМА — пра ролю сямейнага адміністратара, мыццё посуду і запіскі ад паклонніц



Саша Нэма станавіўся найлепшым беларускім поп-выканаўцам і нават змог трапіць у Кнігу рэкордаў Гінеса — за самы працяглы бесперапынны гастрольны тур. Ён раз'язджае з канцэртамі па ўсёй краіне, але самыя адданыя паклонніцы чакаюць яго дома: жонка Святлана і дочкі — 13-гадовая Аня і 5-гадовая Маша. Пра тое, як дзеці мяняюць сваіх бацькоў, дзеля якіх момантаў хочацца спяшацца з гастроляў дадому і ў чым роля таты, гутарым са спеваком.

(Заканчэнне на 4-й стар. «СГ».)

■ Трэці ўзрост

ПАКУЛЬ ЧАЛАВЕК РУХАЕЦЦА — ЁН ЖЫВЕ

Былы настаўнік арганізаваў у сябе на кухні ганчарную майстэрню

Яўгену Лявонцьевічу Паліноўскаму 65 гадоў. Але застаць яго дома не так проста. Калі дамаўлялася на сустрэчу, папрасіў заехаць у другой палове дня. Маўляў, да абеду ў яго шмат спраў у горадзе.

Пра сапраўдны боршч, раман з глінай ды абярэг ад старасці

— Якое інтэрв'ю на галодны страўнік?! — сказаў з парога Яўген Паліноўскі, убачыўшы, што я дастала з кішэні дыктафон. — Аня *(звяртаецца да сваёй жонкі)*, налі, калі ласка, журналістцы сапраўднага ўкраінскага баршчу.

Як высветлілася, Яўген Лявонцьевіч родам з Украіны. У Барысаў трапіў па службе больш як 30 гадоў таму. Так тут і пусціў карані. Менавіта ў Беларусі і завязаўся яго раман з глінай.

— У сярэдзіне 90-х уладкаваўся на фірму, якая займалася вырабам і роспісам керамічных вырабаў. Там упершыню ўзяў у рукі гліну. З таго часу з ёй не расстаюся. Ну, як яе можна не любіць?! Яна ж такая прыемная на вобмацак *(працягвае мне кавалачак)*, падатлівая, з яе можна зрабіць усё, што душа пажадае. А давайце я вас навучу свістульку ляпіць?

І ў лічаныя хвіліны бясформенны кавалак гліны ў руках майстра ператварыўся ў галасістую птушачку.

(Заканчэнне на 5-й стар. «СГ».)

«Я ПОБАЧ, ЗВЯРТАЙСЯ»

Словы, якія важна сказаць і пачуць

Ці модна быць шчаслівым? Напэўна, так. Але за ўсмешкамі на здымках могуць хавацца складаныя адносіны з бацькамі ці партнёрам, асабістыя перажыванні, ды шмат іншых праблем. Гісторыі, якія з'явіліся ў сацсетках пад хэштэгамі #faceofdepression і #удепрессиинетлица, расказваюць, як цяжка было людзям у пэўныя жыццёвыя моманты, але яны нацягвалі ўсмешку і ішлі на работу ці па іншых справах. Мы сустрэліся з псіхолагам, гештальт-тэрапеўтам Ірынай КАЛІНОЎСКАЙ, каб высветліць, дзе мяжа, за якой знаходзіцца дэпрэсія, і як дапамагчы тым, хто яе пераступіў.

Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.

— Ці заўсёды стан, калі табе цяжка на душы, сведчыць пра дэпрэсію?

— Існуюць цалкам нармальныя для чалавека станы смутку, суму. Можа быць нейкае адчуванне безвыходнасці, тугі, звязанае з надвор'ем, напрыклад, ці жыццёвымі сітуацыямі. Калі чалавек наогул не сумуе — гэта вельмі дрэнны знак. Іншая справа — працягласць і якаснае напаўненне гэтых станаў. Калі чалавек, напрыклад, перажыў страту,— цалкам лагічна, што ён сумуе некаторы час. Можа адчуваць з гэтай нагоды боль і наогул прывыкнуць да думкі, што смутак паселіцца ў сэрцы назаўжды. Але, калі такі стан становіцца вядучым, і гэта, напрыклад, не смерць каханага, а страта любімай завушніцы... Калі падзея становіцца такой значнай, што чалавек на працягу тыдня або двух ніяк не можа пазбавіцца ад гэтых пачуццяў, уключыцца ў іншыя аспекты жыцця... Дэпрэсія — гэта захрасанне ў негатыўнай падзеі. У нейкі момант яна пачынае сілкаваць сама сябе, бо чалавек спачатку перастае адчуваць радасць і задавальненне, а потым наогул — адценні перажыванняў. Класічна існуе тры групы сімптомаў: псіхічны стан, мабільнасць і разумовая дзейснасць. На падставе іх спецыяліст можа зрабіць выснову.

— Людзі ў сацыяльных сетках гавораць, што ніхто не бачыў іх сапраўдных перажыванняў. Як блізкім своечасова заўважыць змены і дапамагчы?

⇨ ДАРЭЧЫ

Флэшмоб #faceofdepression пачаўся з паста жонкі саліста групы Linkin Park, дзе яна паказала відэа з Чэстэрам Бенінгтанам за 36 гадзін да самагубства. На ім ён усміхаецца, і, здаецца, нічога не прадвяшчае трагедыю...

— Ступені дэпрэсіі бываюць рознымі. Калі яна пераходзіць у цяжкую або клінічную стадыю, гэта прыкметна. Чалавек ляжыць: часцей за ўсё ў яго няма сіл нават устаць. Ён у літаральным сэнсе сцягвае сябе з ложка, не спіць начамі. Такое не заўважыць складана. Я думаю, у сацсетках у многіх выпадках ішла гаворка пра субдэпрэсіўны стан, умераную дэпрэсію, калі чалавек адаптыўны. Ён працуе, можа ўсміхацца, можа пра сябе паклапаціцца. У яго яшчэ ёсць сілы нацягнуць на сябе маску «поспеху».

Тут пытанне да блізкага: у чым яго трывога? Я не думаю, што, калі жывеш разам з чалавекам, у якога ўсё ў парадку, раптам у нейкі момант задумаешся, ці ёсць у яго дэпрэсія. Такая думка на роўным месцы рэдка ўзнікае.

— А што рабіць, калі чалавек закрываецца?

— Размаўляйце, кажыце, што заўважаеце: вам не ўсё роўна. З дэпрэсіяй можна справіцца першнаперш у псіхолага. Ён вызначыць, ці патрэбныя медыкаменты. Псіхолаг без права іх выпісваць можа накіраваць да спецыяліста. Гэта не абавязкова стацыянар. Цяпер шмат лекаў, якія не выклікаюць прывыкання ці псіхозаў. Прымаць іх, як і іншыя, неабходна акуратна, глядзець за рэакцыяй арганізма. І, вядома, праходзіць псіхатэрапію ў псіхолага. Калі спадзявацца толькі на таблеткі, шанцаў мала. Толькі на тэрапеўта — шанцы ёсць. Сумяшчаць адно з адным — даволі высокія.

— Але, калі своечасова дапамагчы не атрымалася, а чалавек трапляе ў бальніцу... Пасля выпіскі з псіханеўралагічных аддзяленняў многія знаёмыя глядзяць на чалавека, які змагаўся з дэпрэсіяй, насцярожана. Як з гэтым быць?

— З гэтым цяжка змагацца, але трэба выкараніць гэты жудасны перажытак. Па-першае, стацыянара можна пазбегнуць, калі своечасова звярнуцца да псіхолага ці псіхатэрапеўта. Але ж і гэта для нашай культуры амаль прыкра. Я думаю, што галоўная сацыяльная роля флэшмоба ў сацсетках якраз у тым, каб зняць стыгматызацыю з людзей, якія перажылі дэпрэсію. На Захадзе гэта даўно ўжо не так. У нас схадзіць да псіхолага — гэта вельмі сорамна і страшна. Чалавек, зусім далёкі ад псіхалогіі, успрымае такую прапанову як абразу: «Я здаровы». І гэта вялікая праблема. У гэтым сэнсе сацсеткі паказалі, што людзі з дэпрэсіяй — сярод нас. З ёй немагчыма ў адзіночку справіцца — гэта міф. Думаю, наступны флэшмоб павінен быць «я хаджу да псіхатэрапеўта». Такіх людзей вельмі шмат. Не абавязкова наведваць яго гадамі. У чалавека ёсць свой тэрапеўт. Ён нейкі час хадзіў да яго, пакуль выбудоўваў сваё жыццё, працаваў з траўмамі дзяцінства... А потым — гэта падтрымка, да якой можна звяртацца ў пераломныя моманты — заўсёды, калі чалавек няўстойлівы. Гэта месца сілы, куды можна прыйсці пагаварыць і не заставацца сам-насам са сваім жыццём.

— У адной гісторыі ў сацсетках мужчына расказвае, што ў яго была дэпрэсія, таму жонка сядзела з ім, а дзіця аддавалі бабулі. Але мне здаецца, што, калі з'явілася немаўля, жонка, як маці, пераключыла свой клопат на малога, таму муж проста застаўся без увагі і засумаваў. І гэта не дэпрэсія, а патрабаванне ўвагі ад партнёра. Як тут размежаваць?

— Складана адказаць, так гэта ці не, бо мы не ведаем астатніх складнікаў. Ёсць стан, які людзі самі для сябе называюць дэпрэсіяй збольшага таму, што яна да гэтага часу ў нас рамантызаваная: быць у дэпрэсіі — гэта нават неяк прыкольна. Як быццам я маю права запатрабаваць у свету падтрымку. Не папрасіць, падкрэсліваю, а запатрабаваць. Калі ў нашага суайчынніка, напрыклад, гастрыт, у яго не ўзнікае думкі, што жонка павінна ўзяць за ручку і завесці да гастраэнтэролага. Ён сам ідзе да ўрача. А ў стане дэпрэсіі ёсць такое амаль павер'е, што хтосьці іншы павінен. Пажадана блізкі, яшчэ лепш — партнёр. Калі раптам не ўсачыў, то ўсё: які ж ты партнёр! І гэта такая хісткая пазіцыя, якая робіць з хворага ахвяру. З іншага — выратавальніка. Усе адзін аднаму павінны. І няма ў гэтым ні жыцця, ні спантаннасці. Чалавек, хворы на дэпрэсію, сапраўды мае патрэбу ў падтрымцы, але ў тым, каб яе папрасіць і прыняць, — адказнасць яго.

— А як у сярэднім выглядае чалавек з дэпрэсіяй?

— Лічыцца, што гэта чалавек ад 30 да 40 гадоў. Але ў кожнага ўзросту свае рызыкі. Гэта сінусоідная крывая: ад 40 да 60 яна трошкі ідзе на спад, але пасля зноў рэзка ўверх, таму што там дэпрэсія звязана з пакіданнем прафесіі, вымушаным звужэннем кола зносін, страты сацыяльнага ці грашовага статусу. Тут хутчэй карэляцыя не з узростам, а з тым, наколькі чалавек устойлівы сам па сабе, наколькі яго нервовая сістэма спраўляецца з крызісамі развіцця.

— Здаецца, што ў пакаленні, каму цяпер за 50, проста не было часу клапаціцца пра ўсякія жыццёвыя нягоды: ім неабходна было больш працаваць. Тым, хто нарадзіўся ў 90-я, значна лягчэй у матэрыяльным плане, таму ёсць час больш корпацца ў сваіх праблемах. Калі мне сумна, я чую параду «папрацуй і ўсё пройдзе». Можа, у нас занадта шмат вольнага часу?

— Кожны раз перад тым, як спрабаваць жыць мадэлямі іншых людзей, трэба шчыра паглядзець: ці шчаслівы той чалавек, які менавіта так жыве? Уцячы ў працу — гэта папулярны спосаб справіцца, як і ўцячы ў наркатычныя рэчывы ці алкаголь. Сапраўды, перад намі не стаяць тыя мэты, якія былі перад нашымі бацькамі. У нас яны свае. І казаць пра тое, што сучаснаму пакаленню прасцей, таму што яму не трэба выжываць і цягаць баулы з Польшчы на перапродаж, — гэта даволі павярхоўна глядзець на рэчы. У нашым сытым існаванні свае рызыкі — бессэнсоўнасці. Пакаленню да 30 вельмі складана: сапраўды, усё ёсць, а што рабіць далей? І ў гэтым сэнсе вольны час — гэта праблема. Каб ім скарыстацца правільна, даводзіцца шмат думаць. Чалавек, які прытрымліваецца філасофіі «лепш пра гэта не клапаціцца, усё будзе прасцей», рана ці позна прыходзіць да таго, што за яго думаюць іншыя.

— Даволі часта наконт дэпрэсіі клапоцяцца бацькі падлеткаў...

— Падлеткавая дэпрэсія — распаўсюджаная з'ява. У ёй не толькі знешнія прычыны бываюць, але і ўнутраныя, у тым ліку самотычныя, звязаныя з гармонамі. Таму, калі ёсць падазрэнне, што ў пацыента дэпрэсія, спецыяліст адпраўляе яго на аналізы: шчытападобную залозу правяраюць, іншыя гармоны. Прычынай прыгнечанага настрою можа быць і чыстая фізіялогія. А падлеткаў у розныя бакі «каўбасіць». Бацькам адзіная рэкамендацыя на ўсе выпадкі жыцця: быць побач. Гэта неверагодна складана. Ім неабходна клапаціцца і пра сябе. Напрыклад, хадзіць да свайго псіхатэрапеўта. Гэта вельмі эфектыўна ў такім стане, таму што прыходзіць да цябе падлетак і пачынае: «я вас не люблю», «вы мяне не разумееце», «усё дрэнна», «свет несправядлівы», «у мяне няма сяброў». Бацька прыйшоў і сказаў: «Я з табой, мы справімся», — ён у сябе ўвабраў яго перажыванні. А самому што далей рабіць? Калі падлеткавы перыяд працякае цяжка, то адным бацькам не справіцца.

Надзея АНІСОВІЧ.
anisovich@zviazda.by



Толькі ў «Інстаграме» па хэштэгу #faceofdepression знаходзіцца каля пяці тысяч асабістых гісторый.

■ Нататкі таткі

ВАСЁНЧЫН ХЛЕБ

Кожную суботу Аляксандр з дачкой Васілісай разам гатуюць варэнікі ці бліны.

ГІСТОРЫЯ пачалася некалькі дзён таму, але кульмінацыі дасягнула ўчора. Дык вось, у аўторак пасля работы прыходжу па Васілісу ў садок, яна выбягае з групы і суне мне ў рукі абкусаны кавалак белага хлеба. Я без асаблівай увагі паклаў яго ў сумку, вырашыў, маўляў, проста не даела. Хутка сабраліся, пайшлі дадому. Пра хлеб забыліся.

Забіраю Васёну ўчора, яна скача мне на шыю і на ўсю групу жаласна заяўляе: «Татачка, прабач, я сёння табе нічога не вынесла». Няёмкая паўза, усмешкі бацькоў. Пераводзім усё на жарт, збіраемся. Па дарозе дадому Васіліса пачынае дурэць і патрабаваць зляпіць снегавіка. Улічваючы позні час, спрабую выкруціцца: «Васіліса, давай іншым разам. Снег сёння дрэнна лепіцца, ды і тата ж хоча есці...». Дачка рэагуе імгненна: «Татачка, прабач, калі ласка, я хацела пра цябе паклапаціцца, але выхавацелка не дазволіла выносіць ежу...»

І тут мне ўсё стала зразумела: кожны раз, калі мы спяшаемся з садка дадому, я кажу, што хачу есці! Паглядзеў на свайго верабейку ў ружовай куртачцы, і такая радасць накрыла, што ў яе маленькім сэрцы столькі любові і дабрыні.

Сёння прыйшоў на работу, дастаў з сумкі засохлы кавалачак хлеба, размачыў у гарбаце і з'еў. Гэта было самае смачнае, што мне даводзілася каштаваць у сваім жыцці!

Аляксандр АЛЕСІК

■ Быць разам

ПРАДКАЗАЛЬНІЦА НЕ ПАМЫЛІЛАСЯ

Пад Баранавічамі жыве сям'я, якая выхоўвае 11 дзяцей

Калі Вячаслаў Бойван упершыню сустрэў Алену на сямейным свяце ў сваякоў, нават падумаць не мог, што менавіта з ёй яго жыццё не будзе ранейшае. З першага погляду хлопец вырашыў, што гэта тая самая, якая яму патрэбна: адным словам, жанчына яго мары. Сёння іх шлюбу ўжо амаль тры дзесяцігоддзі, а іх сямейнае жыццё вельмі незвычайнае і цікавае: у мужа і жонкі 11 дзяцей! Старэйшаму ўжо 33 гады, малодшай дачушцы Сашы — адзінаццаць.

Жыве вялікая сям'я ў вёсцы Новая Мыш. У прасторным двухпавярховым катэджы, які пабудаваў сам гаспадар. Як прызнаецца Вячаслаў, у сваіх бацькоў ён быў адзіным дзіцем, таму часта сумаваў, калі заставаўся адзін дома. «Затое ў мяне было вельмі шмат стрыечных братоў, з якімі праводзіў нямала часу, — расказвае ён. — Магчыма, у тыя хвіліны ў мяне зарадзілася любоў да вялікай сям'і. Калі я быў у Балгарыі, адна прадказальніца сказала, што ў мяне будзе шмат дзяцей. Не памылілася! Наша сям'я пабудавана выключна на вялікай і моцнай любові».

Адно з самых галоўных правілаў сям'і Бойван — павага да родных і навакольных. Бацька строга сочыць за тым, каб яго дзеці не крыўдзілі малодшых і слухалі старэйшых. Акрамя таго, пры выхаванні дзяцей у прыярытэце — любоў.

Да з'яўлення новага члена сям'і ўсе заўсёды ставіліся добразычліва. У хаце кожны мае свой абавязак, таму дзеці нячаста сварацца паміж сабой.

— У нас поўная хата музыкаў: нехта іграе на піяніна, хтосьці — на скрыпцы або на гітары, — расказвае Алена Бойван. — Апошняй валодаюць усе хлапчукі, не выключэнне і наш тата. Бываюць выпадкі, калі адзін акампануе на піяніна, другі — іграе на скрыпцы. У такія часы ў хаце пануе сапраўдная музычная атмасфера.

Валерыя Бойван, старэйшая дачка ў сям'і, расказвае пра індывідуальныя і разнастайныя інтарэсы сваіх братоў і сясцёр: «Вадзіму 33 гады, з самага дзяцінства ён захапляецца машынамі. Вова, якому трыццаць, мае шмат узнагарод і грамат па брэйк-дансе. 19-гадовая Стэла і 16-гадовая Лучыя захапляюцца прычоскамі і касметыкай, у будучыні мараць быць прафесійнымі візажыстамі. Мара майго брата Дамініка, якому ўсяго чатырнаццаць, — стаць лётчыкам. 11-гадовая Саша ў будучыні хоча ратаваць людзей, а Улада, якой трынаццаць, вельмі ярка праяўляе сябе ў творчасці і спорце. Абедзвюм дзяўчаткам падабаецца музыка. Невыпадкова іх запрасілі выступаць у дзіцячым садку ў суседнім аграгарадку. Што датычыцца мяне, то я скончыла факультэт культуралогіі і сацыяльнай дзейнасці і цяпер займаюся арганізацыяй мерапрыемстваў у Новай Мышы.

У вялікай сям'і не засумуеш.

У дружная сям'і — і свае традыцыі. Кожны Новы год уся сям'я збіраецца ў вялікім доме. Сімвалам свята з'яўляецца снегавік, якога дружна лепяць усе дзеці. Летам — іншыя забавы: пікнікі на прыродзе, арганізаваныя паходы ў ягады.

Па словах бацькоў, да іх у госці часта прыходзяць сябры дзяцей. Заўжды адчынены дзверы і для сваякоў, якія навед-ваюцца з іншых гарадоў і вёсак. «Нягледзячы на тое, што ў доме ўвесь час шмат людзей, я не люблю заставацца адна, — прызнаецца гаспадыня. — У рэдкія хвіліны адзіноты я ўключаю тэлевізар, каб хоць штосьці парушала цішыню».

Ганна ГУЦЬКО

■

■ Хочаце — верце, хочаце — не

ТАК БЫВАЕ,

або Гісторыі, падобныя на казку

Часам людзі расказваюць такія рэчы, што міжволі ўсміхнешся і перапытаеш: «Няўжо так бывае»? Пераглядаю свае старыя запісы, інтэрв'ю і заўважаю, што ўжо назбіралася цэлая калекцыя рэальных гісторый, пасля якіх хочацца паверыць у цуды.

ЯК ЗОРКІ СЫШЛІСЯ

Аповеды пра тое, што ў бясплодных пар, пасля таго, як яны ўсынаўляюць дзяцей, нараджаюцца свае, даводзілася неаднойчы чуць у розных дзіцячых дамах. «Я адчыніла цудоўную патаемную дзверцу, за якой выдаюць дзяцей», — жартавала шматдзетная жанчына, якая пасля ўсынаўлення нарадзіла яшчэ трох малых. — І ўпэўненая, што менавіта прыёмны хлопчык, як магніт, прыцягвае да нас бусла».

Але часам адбываюцца і іншыя неверагодныя рэчы, калі здаецца, што нейкая найвышэйшая сіла клапоціцца пра пакінутых хлопчыках і дзяўчынках. Так, у адным сталічным дзіцячым доме пачула такую гісторыю. Неяк прыйшла да іх жанчына. Сказала, што свае дзеці выраслі і яна хоча ўзяць маленькую дзяўчынку. Пазнаёмілі яе з малымі, а кабета не верыць: «Няўжо ўсіх паказалі?» І тут успомнілі, што адна дзяўчынка ў ізалятары з вятранкай. Убачыла яе госця і адразу сказала, што будзе афармляць дакументы на ўдачарэнне, бо менавіта гэтае дзіця ёй прыснілася.

Здавалася, нешта неверагоднае адбываецца, калі вырашаўся лёс Ксюшы Савіцкай. Супрацоўнікі дзіцячага дома расказвалі, што адчуванне было, нібыта ўсе зоркі сышліся над гэтай дзяўчынкай. Ва ўстанове на той час знаходзілася больш за семдзесят дзяцей, але ўсім была патрэбна толькі Ксюша. Пры гэтым розныя людзі адначасова тэлефанавалі, цікавіліся, як справы ў дзяўчынкі. Штодзень да яе з падарункамі наведваўся адзін прафесар. Забраць малую ў прыёмную сям'ю хацела і жанчына, якая напярэдадні была на адным са свят у дзіцячым доме. А тут і родная маці дзяўчынкі аб'явілася, павінілася, што раней ёй было сорамна прыходзіць — не мела чаго прынесці. А цяпер яна вывучылася на кухара, працуе ў школьнай сталовай, афармляе адносіны з грамадзянскім мужам — надзейным, працавітым. «Як забяру Ксюшу, мы распішамся», — запэўнівала жанчына.

Праз нейкі час калектыў дзетдома ездзіў у Заслаўе на экскурсію, і раптам жанчына, якая яе праводзіла, пацікавілася пра Ксюшу Савіцкую. Аказалася, што паўтара года таму яна хацела забраць гэтую дзяўчынку, але муж выбраў іншую. Жанчына ўвесь час малілася, каб толькі ў Ксюшы ўсё было добра. Можа яе малітвы сапраўды былі пачутыя?

А вось наступная гісторыя, якую расказалі мне на Гомельшчыне, наогул нагадвае сюжэт з нейкага фільма. Ірына (імя зменена) цяжка пераносіла трэція роды. Памятае, што ёй стала дрэнна, страціла прытомнасць, што пасля кесарава падпісвала нейкія паперы, што дзіця не выжыла... Але праз некаторы час жанчыне пачынае сніцца нябожчык бацька, які гаворыць: «Твой сын жывы»...

Прайшло некалькі гадоў. Ірына змяніла месца працы. І калі яна дабіралася да яго, праходзіла міма дзіцячага дома. Тут гулялі дзеці, і яна не магла адарваць вачэй ад аднаго з хлопчыкаў — так ён быў падобны на двух яе сыноў. Дзіця заўважыла доўгі позірк, павіталася, загаварылі. У наступныя дні хлопчык ужо сам пільнаваў, калі новая знаёмая будзе ісці з работы. Цяжка перадаць, што перажыла Ірына, калі высветлілася, што яе маленькі сябар з дзіцячага дома нарадзіўся ў той жа самы дзень і ў тым жа самым месцы, дзе ў жанчыны прайшлі трэція роды. Яна ўпэўненая, што сустрэла свайго сына, з якім яе разлучылі ў выніку нейкай страшэннай памылкі. І сёння, калі яны ўжо жывуць разам (жанчына забрала малога з дзетдома), ёй нічога не хочацца высвятляць, каб не расчаравацца ў сваім цудзе.



Той самы цудадзейны Барысаў камень у Полацку. Фота носіць ілюстрацыйны характар.

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

ЦУД НА КАЛЯДЫ

Многія людзі заўважаюць, што неверагодныя рэчы часта з імі адбываюцца менавіта пад Новы год і Каляды. Ці не таму, што ў гэтыя дні мы так чакаем цудаў, загадваем столькі жаданняў, якія, дарэчы, часта спраўджваюцца? А можа, у зімовыя святы мы проста больш уважлівыя да таго, што адбываецца з намі, а на рэчы, якія здараюцца ў іншы час, проста не звяртаем увагі?

Калі Таццяна Рыжкова на Каляды варажыла са сваімі сяброўкамі, ёй выпала, што на працягу года яна выйдзе замуж і народзіць дзіця. Яна толькі пасмяялася — надта ўжо хуткае развіццё падзей, тым больш што на той момант у яе нават хлопца не было. Але ўсё спраўдзілася. Варажба нават падказала імя жаніха. Дзяўчаты ставілі на стол паднос з вадой, клалі абапал паперкі з мужчынскімі імёнамі і запускалі лодачку, каб спынілася каля імя нарачонага. Таццяна разоў з сем раскручвала лодачку, але ўвесь час тая прычальвала каля аднаго і таго ж імя.

Аднойчы пад Новы год, калі дызайнер Эла Даурава гандлявала калядными сувенірамі, да яе падышла адна з былых кліентак і пахвалілася: «Ведаеце, летась мне прыснілася дзіця-анёльчык. На кірмашы я ўбачыла вашыя лялькі-анёлы — ну як з майго сну. Набыла адну цацку — і ў мяне насуперак усім дыягназам нарадзілася дзіця».

Калі Валерыю Свірыдаву сябры паклікалі на Каляды, яна спачатку адмовілася, а ў апошні момант спахапілася, абы як сабралася, выскачыла з дома і панеслася да аўтобуса. Але да сяброў яна так і не даехала. Паслізнулася. Незнаёмы хлопец, што стаяў на прыпынку побач, падхапіў, не даў упасці. Ці трэба гаварыць, што ён стаў яе мужам?

Вольга Бурык са сваім хлопцам нечакана рассталася 31 снежня. Усю навагоднюю ноч праплакала. А ўжо на Каляды пазнаёмілася з хлопцам, з якім шчасліва жыве сем гадоў. І яна ўпэўненая, што нічога ў жыцці не бывае выпадкова. Відаць, сварка з першым хлопцам была неабходная для таго, каб яна не прапусціла сапраўднае каханне.

Але нарачоных, аказваецца, можна і выпрасіць. Падчас экскурсіі па Полацку я звярнула ўвагу на шыкоўна апранутую жанчыну з яркім макіяжам, на высокіх абцасах. Бачна было, як той цяжка даецца дарога ў такім адзенні, асабліва, калі трэба было падымацца па прыступках да Барысавага каменя, які нібыта выконвае жаданні. Нават экскурсавод спыталася: «Вы ж ведалі, што давядзецца шмат хадзіць, чаму ж так апрануліся?» А турыстка адказала: «Я столькі гадоў была адзінокая. А калі ў мінулы раз прыязджала сюды, папрасіла ў каменя «хоць якога-небудзь мужчыну». І прыбіўся да мяне адзін, праўда, выпіць любіць. А цяпер я ў каменя хачу «заказаць» ужо нармальнага мужчыну».

А можа сапраўды, каб жыць у казцы, трэба ў яе паверыць?

Алена ДЗЯДЗЮЛЯ. *dziadziula@zviazda.by*

■

«ЛЮБЛЮ ДАРЫЦЬ ЖОНЦЫ КВЕТКІ»



Улетку спявак з сям'ёй выбіраецца на мора.

«Сям'я — гэта пастаянны кампраміс»

— З жонкай вы пазнаёміліся яшчэ падчас вучобы ў Гродзенскім дзяржаўным каледжы мастацтваў. Памятаеце тую сустрэчу?

— Гэта было на фестывалі ў Навагрудку. Мы выступалі на адной сцэне: Света са сваім калектывам танцавала, а я спяваў. Потым два месяцы не мог яе знайсці. Я вучыўся на эстрадным аддзяленні, а жонка на харэаграфічным — а там усе дзяўчаты аднолькавыя: з зачасанымі валасамі, у чорнай форме... Пазней была студэнцкая дыскатэка. Калі заіграла павольная кампазіцыя, я ўзяў за руку першую дзяўчыну, што трапілася, і ёй аказалася менавіта Света. Вось так лёс звёў нас.

— Пэўна, першыя гады жылі сціпла?

— Калі мы пераехалі ў Мінск, у нас была торба з адзеннем, падушка, магнітафон і пяць долараў у кішэні. За кватэру першы час плацілі Свеціны бацькі. А я стараўся зарабіць як мог — спяваў на вяселлях, у рэстаранах. Не спяшаўся жаніцца, бо разумеў, што не магу яшчэ забяспечваць сям'ю з дзецьмі. Толькі калі адчуў, што моцна стаю на нагах, прапанаваў пайсці ў загс.

— Які перыяд у адносінах быў самы складаны?

— Не буду ўдавацца ў падрабязнасці, але здараліся моманты, калі ўсё вісела на валаску. Прызнаюся, 99 працэнтаў «касякоў» — мае. Мы дагэтуль разам дзякуючы жонцы. Я заўсёды ведаў, што гэта мой чалавек.

Мне здаецца, любы канфлікт павінен прайсці выпрабаванне часам. Мусіць узнікнуць паўза, каб усе бакі памаўчалі і ацанілі абстаноўку. Бо з гарачкі можна нагаварыць многа лішняга.

— Ваша жонка перастала даваць інтэрв'ю і не хоча быць публічнай. Чаму?

— У яе свае ўнутраныя правілы, забабоны, магчыма. Ёсць прыватная прастора, у якую не хочацца пускаць. Мы нават у сацыяльных сетках жывём паасобку. І пільна назіраем адно за адным *(смяецца)*.

— Калі адзін з сужэнцаў — публічны чалавек, складаней захаваць адносіны?

— Складаней, калі абое публічныя. Калі б мая жонка была спявачкай, шлюб цягнуўся б нядоўга. Для гэтай прафесіі характар павінен быць дастаткова дзёрзкі, і

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «СГ».)

З жонкай Святланай Саша Нэма пазнаёміўся 18 гадоў таму.

«Грошы дачцэ закідваю на банкаўскую картку. Няхай лепш так: я магу кантраляваць, дзе і за што дзіця заплаціла».

«Самыя складаныя канцэрты — у родным Слоніме»

— Колькі дзён на год праводзіце на гастролях?

— Не лічыў, вельмі шмат. Але калі ты ў межах Беларусі, можна спакойна вяртацца начаваць дадому. Іншая справа, што ты а пятай раніцы прыязджаеш, да абеду спіш і з'язджаеш, так ні з кім не павітаўшыся. У гастрольную паўзу на пару дзён магу пагрузіцца ў студыйную работу.

— Сям'я ходзіць на вашы канцэрты?

— Так, але я не люблю, калі мае блізкія знаходзяцца ў зале. Цяжэй працаваць. Самыя складаныя канцэрты для мяне — у родным Слоніме, хоць заўсёды ведаю, што будзе поўная зала. Падчас канцэрта я размаўляю з публікай: расказваю гісторыі, адказваю на пытанні. А калі ў зале сядзяць мама з татам, асабліва не развернешся *(усміхаецца)*.

— Падчас канцэртаў вам перадаюць шмат запісак. Што ў іх? Паклонніцы прызнаюцца ў каханні?

— Некаторыя прапануюць стаць зяцем! Бываюць і падарункі, дзесьці наіўныя. Дзяўчаты хочуць вылучыцца, спадабацца і ў грымёрку што толькі не прыносяць: мяккія цацкі, шакаладкі, шампуні. А вось каб ключы ад «Бэнтлі» — такога не было. Праўда, я і не хацеў бы. Не ведаў бы, як рэагаваць. Не прывык да падарункаў.

— Жонка не раўнуе?

— Хто ж яе ведае — не прызнаецца. Істэрык ніколі не было. Можам нават пажартаваць з запісак. А як без паклонніц? Што я тады раблю на сцэне? У мяне канцэрт заканчваецца, і я яшчэ гадзіну не магу сысці са сцэны, бо не адмаўляю нікому ў аўтографах і фота.

«Кветкі з канцэртаў дадому не вязу. Магу на запраўку любую заехаць і раздаць жанчынам».

Жонка мне давярае. Яна не тэлефануе па дзесяць разоў і не пытае, дзе я. Мне ў гэтым плане пашанцавала. А вось калі Света некуды выходзіць, я ёй праз кожныя пяць хвілін званю.

— Дзеля якіх момантаў спяшаецеся дадому?

— Калі вязу падарункі. Люблю рабіць сюрпрызы. На Восьмае сакавіка неяк жонцы машыну купіў. Апошнім часам мне падабаецца дарыць ёй кветкі проста так. Жонка настолькі радуецца букетам! Я заўсёды думаў, што гэта бессэнсоўна, але працуе — дазваляе зарабляць бонусы.

Кветкі з канцэртаў я дадому не вязу. Магу на запраўку любую заехаць і раздаць жанчынам.

«Добры тата — гэта нешта вельмі сентыментальнае»

— На сцэне ў вас вобраз хулігана. Дома вы такі ж?

— Не паверыце, але я магу нават прыборку зрабіць. Вельмі люблю чысціню. Я перфекцыяніст — у мяне ўсё павінна ляжаць роўненька. Не пачну працаваць, пакуль рэчы не на сваіх месцах. Магу а трэцяй гадзіне ночы прыехаць дадому і памыць посуд, хоць у нас ёсць пасудамыечная машына. Спадзяюся, жонка не прачытае, але мне падабаецца гэты занятак — такі момант медытацыі і рэлаксу.

— Дзеці мяняюць сваіх бацькоў?

— Адназначна. Яны выхоўваюць адказнасць. Стараешся пазбавіцца ад дурных звычак, каб быць для дачок прыкладам. Такое адчуванне, што разам з дзецьмі ты пражываеш яшчэ адно жыццё. Я зноў у маленстве — мне цяпер 13 і 5. Гэта вялікае шчасце. Не ўяўляю, як дарослыя жывуць без дзяцей.

— Хто больш строгі — вы ці жонка?

— Я. Святлана спрабуе быць строгай, але дочкі не слухаюцца, бо мама заўсёды побач. Часта добрым матыватарам для дзяцей становіцца фраза: «Я зараз патэлефаную тату». Але пытанне павышанага тону ў сям'і не стаіць. За 18 гадоў сумеснага жыцця моманты, калі хтосьці прыкрыкнуў, можна па пальцах пералічыць. Таму дзеці і ў садку не змаглі знаходзіцца: выхавацелі не заўсёды захоўваюць спакой.

— У вашай сям'і часта гучыць слова «нельга»?

— Вельмі рэдка. Бо калі штосьці забараняць, дзіця будзе настойліва спрабаваць гэта зрабіць. А так цікавасць знікае імгненна. І бацькі нервы не трацяць.

— Вы казалі, што любіце рабіць падарункі. Дзеці не растуць разбалаваныя?

— Не. У дачок ёсць гіраскутары, планшэты, гульнявыя кансолі, але гэта ўсё не надта запатрабавана. Я іх у большай ступені для сябе купляў *(смяецца)*. Старэйшая вельмі перажывае, калі ёй прыходзіцца прасіць у мяне грошы. Разумее, што тата працаваў, каб іх зарабіць. Грошы я ёй закідваю на банкаўскую картку. Няхай лепш так: я магу кантраляваць, дзе і за што дачка заплаціла.

— Чытала, што на вас ляжыць клопат пра школу, урачоў...

— Я такі сямейны адміністратар. Мая жонка без паняцця, якога чысла плаціць за святло і тэлефон. Таму ўсё на мне. Нават з участковай медсястрой знаёмы.

— У чым бачыце ролю таты?

— Быць стрыжнем, апорай. Добры тата — гэта нешта вельмі сентыментальнае: ён — і мяккі, і моцны адначасова. Ён як добры чараўнік, які незразумела як, але вырашыць любое пытанне.

«Усе важныя рашэнні прыняў дзякуючы парадам Светы»

— Што слухаюць вашы дзеці?

— Не ведаю. Старэйшая дачка ў навушніках пастаянна. Натуральна, ім даводзіцца і маю музыку слухаць. Калі езджу ў машыне, часта ўключаю новыя песні і аналізую іх: ці не трэба дапрацаваць? Дома гучаць замежныя кампазіцыі — жонка любіць. А я стараюся менеў упускаць у сваё жыццё чужой музыкі, якая мне падабаецца, бо воляй-няволяй пачнеш капіраваць.

«Жонка мне давярае. Яна не тэлефануе па дзесяць разоў і не пытае, дзе я. Мне ў гэтым плане пашанцавала».

— Кім дочкі хочуць быць?

— Старэйшая шэсць гадоў займалася мастацкай гімнастыкай, і былі добрыя дасягненні на рэспубліканскім узроўні. Але мы зразумелі, што ў дачкі няма дзяцінства. І вучыцца яна не паспявала. Таму скрозь слёзы вырашылі, што з гімнастыкай трэба заканчваць. Тым больш у сучасным спорце столькі несправядлівасці і падману. У дачкі толькі ў гэтым годзе былі першыя паўнавартасныя летнія канікулы. Цяпер Аня займаецца танцамі ў студыі. Ёй падабаецца хіп-хоп, вог. На танцы не так шмат часу ідзе, і ў гэтым больш імправізацыі і творчасці.

А малодшая Маша вельмі любіць жывёл. Гэтым яна пайшла дакладна не ў тату: я баюся ўсяго, што большае за хамяка *(усміхаецца)*.

— Як любіце адпачываць сям'ёй?

— Калі ёсць некалькі вольных дзён, едзем да бацькоў у вёску. Любім на каток схадзіць ці ў парк. А летам выбіраемся на мора. Света мая загарае, а я з дзецьмі бегаю, бо не магу доўга ляжаць на сонцы.

— Адна з вашых апошніх песень называецца «Трэба нешта мяняць». А вы хацелі б штосьці памяняць у сваім жыцці?

— Кожны прыходзіць да нейкага этапу, калі трэба выбірацца з зоны камфорту, каб рухацца далей. Мяне падштурхоўвае жонка: усе глабальныя рашэнні, нават будаўніцтва ўласнай студыі, я прыняў дзякуючы яе парадам. Пастаянна прыходзіцца нешта мяняць у сваім жыцці, каб дасягнуць большага.

«Разам з дзецьмі ты пражываеш яшчэ адно жыццё. Я зноў у маленстве — мне цяпер 13 і 5».

Наталля ЛУБНЕЎСКАЯ.
lubneuskaya@zviazda.by

ПАКУЛЬ ЧАЛАВЕК РУХАЕЦЦА — ЁН ЖЫВЕ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «СГ».)

— На кірмашах маладыя бацькі часта набываюць у мяне свістулькі для сваіх дзетак: экалагічна і нядорага. Раблю таксама і іншыя ўтылітарныя рэчы: аромалямпы, цукарніцы, скарбонкі... Але найбольш мне падабаецца ляпіць статуэткі, бо яны дазваляюць задзейнічаць фантазію па поўнай.

У зале на часопісным століку — некалькі дзясяткаў вырабаў Яўгена Лявонцьевіча. Больш за ўсё мне спадабаўся дамавічок з рагаткай, соскай ды мячом.

— Гэта абярэг ад старасці, — смяецца майстар. — Але найбольшай папулярнасцю карыстаецца мая «п'яная» тэматыка. Прычым і сярод вядомых людзей. Сямён Альтаў шораз, калі прыязджаў на «Славянскі базар», набываў маіх гліняных п'яніц у сваю калекцыю. Упершыню, калі ўбачыў іх, сказаў: «У нас у Піцеры такога няма». Прыемна, што гумарыст аценіў мой гумар. Набывалі ў мяне статуэткі і такія акцёры, як Яўген Сядзіхін, Анатоль Кацянёў... А адзін дзядуля наогул калекцыянаваў мае работы. З кожнай пенсіі прыходзіў і набываў па некалькі штук. Апошнія гады я яго не бачыў, нават хвалявацца пачаў. Пасля выпадкова даведаўся, што ён сышоў у лепшы свет. Наогул дома ў мяне, як бачыце, мала работ. Усё, што ляплю, прадаю на кірмашах, дару знаёмым. *(Пасля гэтых слоў Яўген Лявонцьевіч працягнуў мяне гліняную падкову са званочкам. —* **Аўт.***)* Гэта вам, на шчасце. Будзе памяць аб гэтай сустрэчы.

Пра музей ведзьмаў, самы вялікі заробак ды бакенбарды

Фантазіі Яўгена Паліноўскага можна ўбачыць таксама ў мясцовым краязнаўчым музеі. А адна работа знаходзіцца нават у Амерыцы...

— Старшыня Мінскай асацыяцыі свабодных мастакоў наведваў па рабоце музей ведзьмаў пад Бостанам. Дык папрасіў мяне зрабіць якінебудзь сувенір. Я зляпіў беларускую Бабу-Ягу ў хусцінцы за адным сталом з амерыканскай ведзьмай у капелюшы. Амерыканцам так спадабалася работа, што перадалі мне ў знак удзячнасці бестэрміновы квіток у гэты музей і фірмовую футболку.

Фота Алены ЯНКОЎСКАЙ.

Падчас фестываляў Яўген Лявонцьевіч з задавальненнем праводзіць майстар-класы.

— Жэня, раскажы, як ты ляпіў статуэткі для бельгійскага рэстарана, — нагадвае Ганна Іванаўна.

— У Бельгіі адкрываўся рэстаран. І мне прапанавалі паўдзельнічаць у яго афармленні. Сто работ трэба было зрабіць за тры тыдні. Але адна ўмова: каб ні адна не паўтаралася. Памятаю, сядзеў тады на кухні крукам. Трэба было рабіць у дзень па 11—12 кампазіцый. Усе казкі, анекдоты ды літаратурныя творы, якія ведаў, прыйшлося ўспомніць. А гліна, вы ж ведаеце, сушыць скуру, у мяне пальцы трэскаліся... Адным словам цяжка было, але замову я выканаў. Праўда, і заплацілі мне тады добра. Менш чым за месяц атрымаў свой гадавы настаўніцкі заробак.

Значную частку свайго жыцця Яўген Паліноўскі прысвяціў школьнікам: вучыў іх маляваць ды ляпіць з гліны. Сёлета яго, як пенсіянера, скарацілі. Прызнаецца, што спачатку засмуціўся, бо ўсю душу ўклаў у школьную студыі керамікі. Але зразумеў, што перажываннямі гору не дапаможаш, і тут жа пачаў шукаць сабе новае месца працы. Цяпер ён вучыць ляпіць з гліны малых у дзіцячым садку, што насупраць яго дома.

— Працаваць трэба. Нават не таму, што грошы патрэбныя (хоць і маленькі кавалачак масла на пенсійнай лусце хлеба лішні не будзе). Пакуль чалавек рухаецца — ён жыве. Я супрацоўнічаю з нашым цэнтрам народнай творчасці. Пастаянна езджу з імі на розныя мерапрыемствы, фестывалі, праводжу майстар-класы. Раней людзі часта прыносілі фотаздымкі сваіх каханых ці калег, прасілі зрабіць шаржы з гліны. Мне гэта таксама падабалася. Праўда, чамусьці жанчыны горш атрымліваліся. З мужчынскімі вобразамі працаваць прасцей. У аднаго — лысіна, у іншага — вусы ці бакенбарды. Мужчынскія твары лягчэй апрацоўваць. У жанчын жа больш тонкая натура. Але ні разу за столькі гадоў ніхто не адмовіўся ад работы.

— Пра што марыце?

— Вучняў хочацца зноў. Быў час, калі да мяне дзеці хадзілі маляваць нават дадому. Памятаеш, Аня?

— Так, ты тады сышоў з 20-й школы, дзе выкладаў выяўленчае мастацтва. Дык яны прыходзілі дадому займацца. Проста так, бясплатна.

— Як кажуць, з кім павядзешся, ад таго і набярэшся. Працуеш з дзецьмі і сам у душы маладзееш. Яны не даюць сумаваць. Я для іх быў як дзядуля. Іду па школьным калідоры, а хлопцы ды дзяўчаты бягуць рукі расставіўшы, абвешаюць мяне з усіх бакоў. У нас вучылася шмат дзяцей з няпоўных сем'яў, дык яны да мяне хіліліся. Мае ж урокі былі не абавязковыя для наведвання, тым не менш многія прыходзілі і ляпілі па 2—3 гадзіны.

Пра хваробу Альцгеймера, самаробную каўбасу ды тушонку з трусоў

— Пасля таго, як сышлі са школьнай студыі керамікі, дзе вы зараз лепіце з гліны?

— Вось тут, у кватэры. Жонка абед прыгатавала — і да вечара кухня ў маім распараджэнні. Зляпіў і сушу на шафе, што побач з газавай плітой. Потым абпальваю ў самаробнай печцы. Яна ў мяне маленькая, шмат месца не займае.

— А не думалі набраць групу пенсіянераў і вучыць іх лепцы з гліны?

— Так, я ўжо думаў пра гэта. Лепка ж лічыцца цудоўнай гімнастыкай для мозга, папярэджвае хваробу Альцгеймера.

Дома ў майстра работ няшмат. Усё, што лепіць, прадае або дарыць.

— Што параіце пенсіянерам, якім, як і вам, не пашчасціла, і іх скарацілі на працы?

— Не апускаць рукі. Усё адно трэба нешта рабіць. Часта бачу пенсіянераў, якія збіраюцца кучкамі на лавачках каля пад'ездаў. Ім сумна, на іх тварах рэдка ўбачыш усмешку. А чаму б не заняць сябе нейкай справай? Для гэтага ж не абавязкова мець шмат грошай. Можна пад акном шматкватэрнага дома кветкі разводзіць ці разбіць агарод на падаконніку. Сёлета я ўпершыню на балконе агуркі пасадзіў. Сартоў пяць розных. І што вы думаеце, выраслі. І такія смачныя, не тое што з крамы. Зрываеш, та-а-а-кі водар на ўсю кватэру!

— Жэня — халерык па тэмпераменце, — кажа Ганна Іванаўна. — Пастаянна штосьці новае асвойвае, эксперыментуе. Кім ён толькі не працаваў: і керамістам, і садоўнікам, і пекарам. Быў час, калі маляваў афішы з анонсамі фільмаў для кінатэатра «Кастрычнік». Некалькі гадоў працаваў у жаночым манастыры. Ён асвойвае новую справу да таго часу, пакуль у яго не атрымаецца. Калі атрымалася, пераключаецца на штосьці іншае. У канцы 90-х мы купілі дом у вёсцы. Ён адразу ж градкі ўскапаў, цяпліцы паставіў. Навыпісваў рознага насення. Памятаю, мы з дзецьмі паехалі на мора. Пакуль вярнуліся, ён ужо поўны склеп закрутак нарабіў. Вяскоўцы здзіўляліся, як гарадскі жыхар можа быць такі гаспадарлівы *(смяецца)*. Спрабаваў разводзіць парасят, куранят-бройлераў, трусоў. Ад трох самак 300 трусікаў было. Тушонкі нарабіў так шмат, што тры гады елі і знаёмых частавалі.

— Я гатаваць люблю не менш, чым ляпіць з гліны.

— Ён наогул з кухні не вылазіў бы, калі б не выганяла *(смяецца)*. Цяпер у інтэрнэце шмат рэцэптаў, пастаянна эксперыментуе.

— Можа, ёсць фірменная страва?

— Вядома! Мая «каронка» — гэта самаробная каўбаса. Кураціну рэжу на кавалачкі. Пажадана, каб была і грудзінка, і сцягно — гэта мяса рознае па колеры. Затым дадаю крыху (працэнтаў 15—20 ад агульнага аб'ёму кураціны) свінога сала, лепш, каб яно было з прожылкамі. Звяртаю ўвагу, што яно рэжацца драбней, чым кураціна. Дадаю спецыі, пару лыжак маянэзу, шмат часнаку. Перамешваю і запіхваю ў кішку. Кладу каўбасу на патэльню, абцягваю яе фольгай для выпечкі — і ў духоўку хвілін на 30. Такая смаката атрымліваецца — за вушы не адцягнеш!

— А наша гродзенская нявестка вельмі любіць Жэневы кулічы.

— Пяку іх не толькі на Вялікдзень. А шораз, калі едзем туды ў госці. Іх фішка ў тым, што доўга не чарсцвеюць. З цестам наогул у нашай сям'і працую ў асноўным я. Пяку піражкі, бліны, аладкі... Нядаўна навучыўся рабіць хлеб і нават багеты. Не трэба баяцца спрабаваць нешта новае. У любым узросце.

Надзея ДРЫНДРОЖЫК.
nadzieja@zviazda.by
г. Барысаў.

Я без доктара лячуся...

Вядома, даўней людзі хварэлі, але ніякіх дактароў не ведалі. Лячыліся больш зёлкамі, малаком, здорам... Веды перадаваліся з пакалення ў пакаленне.

Калі забаліць жывот — заварвалі гарбату з рамонку, сушаных чарніц, калі галава — абвязвалі яе туга хусткай, прыклаўшы капусны ліст або намочаную ў квасе анучку. Часта здаралася, што парэжаш у полі сярпом руку (ці дома нажом), дык расціралі лісточкі крываўніку, прыкладалі і перавязвалі. Сінякі лячылі «бабкай» (падарожнікам), лістом капусты, лопухам.

Зёлкі ў нас збіралі абавязкова на Яна. Казалі, што гэты дзень дае ім гаючую сілу. Я хадзіла з бабуляй, таму шмат зёлак ведала. Дачка мая — правізар, то казала, што ўсе яны правільна падбіраліся. Вось табе і цёмныя людзі.

Пры прастудзе таксама былі адмысловыя лекі. Звычайна дзяцей паілі журавінным морсам. Журавіны на гарышчы стаялі заўсёды. Іх выкарыстоўвалі не толькі пры прастудзе, але і пры галаўным болі. Таксама гатавалі адвар з маліннiку (ці чабару, падбелу, кветак ліпы). Мая бабуля рабіла яшчэ і так: разразала цыбуліну напалам, разрэзаным бокам клала на гарачую чыгунную пліту, яна падпякалася, а тады, як трошкі астыне, націрала мне далоні, падэшвы ног і цёпленька ўхутвала на ноч. Назаўтра адчуваеш сябе амаль здаровай, хоць яшчэ цяжкавата на свет глядзець. Уставаць ні за што не даюць. Тры дні з ложка і не рухайся.

Калі тэмпература трошкі спадала або балела горла, дык давалі кіпячонае малако з мёдам, маслам ці здорам. Слоік мёду

Адданая падпісчыца «Звязды» Яўгенія Барысаўна КУЛЕВІЧ.
(Момант «злавіў» яе сын.)

быў у кожнага ў запасе на такую патрэбу. А малако, калі свайго няма, бралі ў таго, у каго ёсць: хвораму ніхто не адмаўляў.

У кожнай хаце была бутэлечка шкіпінару. Называлі яго «тарпатына». Націраліся ім, папярэдне змяшаўшы са свіным здорам (толькі я не ведаю, у якіх прапорцыях), пры болю і ламоце ў касцях.

Пры пякучцы трэба было пажаваць гарошыну або бобіну. Боб, трэба сказаць, садзілі цэлымі градкамі. Яго варылі, папярэдне намачыўшы на ноч.

Выкарыстоўвалі і насенне лёну. Ім прыкладалі нарывы і пілі пры праблемах са страўнікам. Ужывалі таксама адвары палыну.

У нас на ўчастку было балотца (называлася куп'ё). Там на купінах расла асака, а паміж купінамі была чорная твань. У дажджлівае надвор'е, вядома, стаяла вада. Мы скакалі з купіны на купіну, а асака рэжа ногі, рукі, таму ўсе былі ў пісягах. Ды яшчэ залезем з суседскай дзяўчынай Галяй у твань, ногі чорныя па калена і хвалімся сваімі «боцікамі». Калі змываем, дык лыткі абвяваюцца ветрам і колюцца. Прыганяеш вечарам кароўку дамоў, а ногі смыляць, дзецца няма дзе. Днём то і не чулася. Вечарам бабуля мыла мае ногі цёплай вадой (мне не давярала, бо я памачу ды і ўсё), затым старанна выцірала і мазала вяршкамі. Ці так, ці так, яны пякуць, але заснеш хутка, бо налёталіся. Назаўтра парэзы заступіліся.

Дома ўшчуваюць, каб не лазіла па куп'і. Іншым разам, праўда, устрымаешся, але як магнітам цягне ў гэтае балота. Аднойчы ў мяне па ўсім целе пайшлі вадыры. Я спужалася і пагнала кароўку дамоў. Бабуля паглядзела і кажа: «Нічога, хутка пройдзе!» Яна заварыла браткі палявыя (фіялка). Загадала памыцца імі, змачыла ўсё цела. Пакінула мяне паляжаць, а сама пагнала кароўку на пашу. Мама мяне пагладзіла, стала апавядаць нейкую казку (мусіць сама выдумала), што браткі гояць болькі на целе, што фіялетавы колер — гэта брацік, а чырванаваты ці жоўты — сястрычка. Яны ў кветачкі ператварыліся, каб дапамагаць людзям. Назаўтра ў мяне ўсё прайшло.

Яўгенія КУЛЕВІЧ, *в. Сялец.*

Объявление о торгах

Наименование (описание), местонахождение и стоимость имущества	Лот №1. Автомобиль «Тойота Старлет», 1992 года выпуска, регистрационный номер 9694ВТ6. Первоначальная стоимость – 807 рублей
Собственник (владелец) имущества	Зейналов Нариман Олегович
Местонахождение (адрес) имущества	г. Орша, 2-й пер. Коммунальный, 2, штраф-стоянка КУП «Оршанская спецавтобаза»
Информация об обременениях	Без обременений
Место (адрес), дата и время проведения торгов	г. Орша, ул. Островского, 36, каб. 5. 8 февраля 2018 года в 11.00
Справочная информация	Отдел принудительного исполнения Оршанского района и г. Орши, 211030, г. Орша, ул. Островского, 36. Судебный исполнитель – Коробова Ольга Владимировна, тел.: 80216543215, 80333998323. Начальник отдела – Павлюченкова Наталья Евгеньевна, тел. 80216543213
Условия и порядок проведения торгов	1. Подать письменную заявку на участие в торгах и дать подписку об отсутствии препятствий для приобретения имущества, предусмотренных законодательством. 2. Внести задаток в размере 10 процентов от стоимости имущества (по каждому лоту) на депозитный счет отдела принудительного исполнения Оршанского района и г. Орши BY22AKBB36429030007942200000 АСБ Беларусбанк г. Орша, код банка AKBBBY21215, УНП 300002505, не позднее 05.02.2018 г. Минимальная величина первого шага – 5 % стоимости каждого лота. В соответствии со ст. 97 Закона «Об исполнительном производстве» возмещение затрат на организацию и проведение торгов осуществляется участником, выигравшим торги

ВНИМАНИЕ!!!

Коммунальное топографо-геодезическое унитарное предприятие «ГОМЕЛЬГЕОДЕЗЦЕНТР» с открытого аукциона по продаже земельных участков в частную собственность в г. Гомеле № 2-С/2018, который состоится 7 февраля 2018 г., СНИМАЕТ следующие лоты: лот № 3 – по пер. Луговому 2-му (участок № 5) и лот № 4 – по пер. Луговому 2-му (участок № 6) по причине внесения изменений в земельно-кадастровую документацию

Наш контакт: +375 0232 41 97 86 Информация размещена на сайте: www.gomel.gov.by либо geodezcentr.by

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

РУП «БЕЛСПЕЦКОНТРАКТ»15 февраля 2018 года проводит 2-й открытый аукцион по продаже имущества республиканской собственности

Номера лотов	Наименование техники	Местонахождение объекта	Начальная цена продажи (бел. руб.)	Сумма задатка (бел. руб.)
9	Трубопровод ПСТК-100х1,5 № 28 1962 г. *4 кат.*	н. п. Красн. Берег, в/ч 55461	8 000,00	800,00
10	Трубопровод ПСТК-100х1,5 № 319 1965 г. *4 кат.*	н. п. Красн. Берег, в/ч 55461	8 000,00	800,00
11	Грузовой Урал-4320-0011-01 ш. 170560 дв. 760097 1991 г. *3 кат. 110 091 км*	г. Береза, в/ч 23324	7 000,00	700,00
12	Автошасси Урал-375АМ ш. 404871 дв. 949609 1983 г. *4 кат. 3 474 км*	г. Береза, в/ч 23324	5 000,00	500,00
13	Грузовой КамАЗ-43106 ш. 0005668 дв. 0696484 1990 г. *3 кат. 118 663 км*	г. Береза, в/ч 23324	7 500,00	750,00
14	Специальный автомобиль КамАЗ-43101 с кузовом-фургоном К.4320Д в составе: кузов-фургон К.4320Д № 050911 1987 г. *2 кат.* Автошасси КамАЗ-43101 ш. 0029489 дв. 0057021 1987 г. *3 кат. 3 745 км*	г. Кричев-2, в/ч 33190	8 000,00	800,00
15	Специальный автомобиль Урал-375 с кузовом-фургоном К2-375 в составе: кузов-фургон К2-375 № 09093 1986 г. *4 кат.* Автошасси Урал-375 ш. 451212 дв. 734595 1986 г. *3кат. 8 401 км*	г. Кричев-2, в/ч 33190	6 000,00	600,00
16	Специальный автомобиль Урал-375А с кузовом-фургоном К-375 в составе: кузов-фургон К-375 № 06388 1982 г. *4 кат.* Автошасси Урал-375А ш. 382346 дв. 756601 1982 г. *3кат. 1 632км*	г. Кричев-2, в/ч 33190	6 000,00	600,00
17	Специальный автомобиль ГАЗ-66-05 с кузовом-фургоном К-66 в составе: кузов-фургон К-66 № 1-67 1978 г. *2 кат.* Автошасси ГАЗ-66-05 ш. 0111786 дв. 1521645 1978 г. *3 кат. 1 288 км*	г. Кричев-2, в/ч 33190	3 200,00	320,00
18	Специальный автомобиль ГАЗ-66-05 с кузовом-фургоном К-66 в составе: кузов-фургон К-66 № 110577-602/2 1977 г. *2 кат.* Автошасси ГАЗ-66-05 ш. 0086707 дв. 1391530 1977 г. *3 кат. 1 697 км*	г. Кричев-2, в/ч 33190	3 200,00	320,00
19	Специальный автомобиль ГАЗ-66-05 с кузовом-фургоном К-66 в составе: кузов-фургон К-66 № 88574-602/2 1974 г. *2 кат.* Автошасси ГАЗ-66-05 ш. 3960738 дв. 815345 1974 г. *3 кат. 1 790 км*	г. Кричев-2, в/ч 33190	3 200,00	320,00
20	Специальный автомобиль ГАЗ-66 с кузовом-фургоном К-66 в составе: кузов-фургон К-66 № 0978 1977 г. *2 кат.* Автошасси ГАЗ-66 ш. 0111416 дв. 1519835 1977 г. *3 кат. 1 061 км*	г. Кричев-2, в/ч 33190	3 300,00	330,00
21	Специальный автомобиль ГАЗ-66-04 с кузовом-фургоном К-66Н в составе: кузов-фургон К-66Н № 83484 1984 г. *2 кат.* Автошасси ГАЗ-66-04 ш. 0366157 дв. 65154 1984 г. *3 кат. 2 856 км*	г. Кричев-2, в/ч 33190	3 000,00	300,00
22	Специальный автомобиль ГАЗ-66 с кузовом-фургоном К-66Н в составе: кузов-фургон К-66Н № 09284 1983 г. *4 кат.* Автошасси ГАЗ-66 ш. 0350534 дв. 20139283 1983 г. *3 кат. 5 561 км*	г. Кричев-2, в/ч 33190	2 800,00	280,00

Аукцион состоится по адресу: г. Минск, ул. Казинца, д. 2, 6-й этаж **15 февраля 2018 г. в 11.00.**

